Раздзел V

1996-2005: Час адкрытага грамадства

# НАЗАВУ СЯБЕ БЕЛАРУСАМ

### Вакол пытання пра нацыянальнасць

Пытанне пра нацыянальнасць не толькі непатрэбнае, але і шкоднае. Быццам бы яно нявіннае, але скрывае ў сабе тую нотку ўсяго зла, якое праявілася ў спрэчках за манастыр, помнікі ці на выбарах 1997 і 2001 гадоў. Водгукі гэтых здарэнняў надта свежыя і нявырашаны. Выклікалі яны такія ці іншыя боязі, эмоцыі, падобныя на тыя, якія з'явіліся напярэдадні ўсеагульнага перапісу насельніцтва. Сёння запытаюць пра нацыянальнасць, а заўтра — пра веравызнанне. Divide et impera. У чым заключаецца сутнасць праблемы? Гаворыцца, што ў нас дэмакратыя, але ці сапраўды яно так? Адказ на гэтае пытанне складаны. Дэмакратыя — сістэма, у якой грамадзяне, нягледзячы на паходжанне, веравызнанне, колер скуры ў ходзе свабодных выбараў выбіраюць уладу, якая кіруе па волі большасці выбаршчыкаў, зважаючы на правы нацыянальных і рэлігійных меншасцей, каб усе людзі жылі згодна.

Грамадскім фактарам і шанцам на выпраўленне становішча меншасцей з'яўляецца развіццё адкрытага грамадства — гаранта дэмакратыі і здольнасці пераадольвання цывілізацыйных пытанняў. Неабходна стварыць адпаведныя ўмовы, каб людзі вучыліся адкрытаму грамадству, удзельнічалі ў яго будове. У адкрытым грамадстве чалавек не з'яўляецца аб'ектам, а толькі суб'ектам. Міжнародным дакументам, які рэгулюе ахову правоў чалавека, з'яўляецца ААНаўская дэкларацыя ў справе асоб, якія належаць да нацыянальных, этнічных, рэлігійных і моўных меншасцей ад 1992 г., якая да гэтай пары парламентам Польшчы не ратыфікавалася. У ёй адназначна сказана: дзяржава, якая гарантуе грамадзянам поўную бяспеку, мае права патрабаваць ад іх лаяльнасці і наадварот — лаяльны грамадзянін мае права патрабаваць гарантыю бяспекі. Ратыфікацыя гэтай дэкларацыі вырашыць усе далікатныя пытанні. Пазбяганне яе ратыфікацыі пад прычынай абавязвання ў Польшчы падоб-

ных законаў і існавання адпаведных установаў — гэта адгаворка. У выніку ўзнікне чарговы дакумент або чарговая мёртвая, паказная цэнтральная ўстанова, якая абцяжарыць і так драматычны бюджэт дзяржавы. А праблема застанецца нявырашанай. Нацыянальныя меншасці далей застануцца ў нявыгадным становішчы „роўнага сярод раўнейшых". Фінансавыя датацыі на грамадска-культурную дзейнасць нацыянальных меншасцей гэта не ласка, толькі абавязак. Меншасці таксама плацяць падаткі і маюць права імі карыстацца.

Калі б папярэдняя правячая групоўка выканала жэст добрай волі ў адрас меншасцей, не было б цяпер столькі боязі, а нават страху. Пытанне пра нацыянальнасць, каб стварыць банк даных аб нацыянальных меншасцях, неабходных у перамовах з Еўрасаюзам, неабгрунтаваны ў святле нератыфікавання згаданай дэкларацыі. Канстытуцыя РП не адпавядае міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека і грамадзяніна, як гэта мае месца ў шэрагу канстытуцый у дэмакратычных і грамадзянскіх краінах.

**Віктар Аўсяйчук**
21.04.2002

### Якім я быў, такім застаўся

На зломе мая і чэрвеня будзе праводзіцца перапіс насельніцтва. Многа аб гэтым гаворыцца ў сродках масавай інфармацыі, паколькі адно з пытанняў кранае справу нацыянальнасці і мовы.

Пазваніла мне Альжбета Бура з Радыё „Рацыя" з пытаннем, якую я назаву нацыянальнасць у час перапісу. Адказаў я без запінкі: назаву сябе беларусам.

— А чаму так кажаце? — дапытвалася.

— Бабуля мая выходзіць з Кобрына. Бацькі называлі сябе беларусамі. Нават у гітлераўскім канцлагеры бацька не адказаўся ад сваёй тоеснасці. Дык як жа мне цяпер карані продкаў падсякаць? Гэта быў бы перад народам смех, а перад Богам грэх, як гавораць у народзе. Таму кажу: якім я быў, такім застаўся — паўтараюся за словамі рускай песні. Інакш быць не можа!

**Уладзімір Сідарук**
28.04.2002

* * *

У „Ніве” ад 28 красавіка г.г. Уладзімір Сідарук трапна напісаў, што ў час перапісу насельніцтва не ўсе будуць пісацца беларусамі. У Ольштыне я таксама чуў, што людзі беларускага паходжання будуць называць сябе палякамі праваслаўнай веры. Такіх будзе многа і ў Беластоку, Бельску, Гайнаўцы і іншых мясцовасцях. А так быць не павінна, бо цудоўна быць іншым сярод палякаў. Калі мяне сустракаюць прафесары з вучэльні, такія як Станіслаў Ланец, Васіль Белаказовіч ці Валянцін Пілат, дык мы па-беларуску з сабою гаворым. І іншыя палякі, сустрэўшы мяне, найперш пытаюць, як там Лукашэнка, а затым гутарым пра тое, што ў Беларусі адбываецца; так паразмаўляем і развітваемся. Я ведаю, што нават некаторыя з тых, што чытаюць „Ніву”, будуць пісацца рускімі ці ўкраінцамі, якіх не было на Беласточчыне, пакуль Іван Кірызюк не напутаў. На маю думку, трэба ў „Ніве” пра перапіс насельніцтва пісаць як найбольш, а не змяшчаць рэкламы, як нядаўна: „Zbijamy ceny zawodowo”; такіх рэклам маем поўна пад дзвярамі.

На вёсцы цяпер усе маюць кошычкі на мазуркі, але што гэта за Вялікдзень без капанькі, у якой былі паложаны ўсе харчы. У кошычак змесціцца цяпер толькі яечка, каўбаска, соль і ўсё. Калісь мая мама выпякала буслаўую лапу ды булачкі з літарамі „ХВ”; яшчэ цяпер чую іх смак пасля таго, як бацюшка пасвянціў на ўзгорку каля крыжоў у Відаве.

Думаю, што „Ніва” цяпер, перад перапісам, павінна больш усведамляць некаторых беларусаў, кім яны ў сапраўднасці з’яўляюцца. Бо ў гарадах, каб не пашкодзіць кар’еры, будуць пісацца інакш. Я да такіх людзей стаўлюся з агідай, бо мы ніколі не павінны адракацца ад спадчыны нашых продкаў. І трэба адважна сказаць: Я — беларус!

**Андрэй Гаўрылюк**
19.05.2002



# МУЗЕЙ ПАВІНЕН СЛУЖЫЦЬ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

## Што з Музеем?

Справа будучыні Беларускага музея ў Гайнаўцы не дае спакою не толькі мне (глядзі „Самагубны інстынкт" Мікалая Ваўранюка ў „Ніве" н-р 52 ад 24 снежня 1995 г.), хаця з прычыны далечыні і з гадамі грамадскія справы беларускага асяроддзя Беласточчыны аддаляюцца ад мяне.

Беларускі музей у Гайнаўцы паўстаў дзякуючы ахвярнасці беларусаў так з Польшчы, як і з усяго свету. Сабраныя „цаглінкі" злажылі перад усім гайнаўскія дзеячы на чале з Кастусём Майсенем, які фактычна, як піша М. Ваўранюк, з'яўляецца „чалавекам-гісторыяй, чалавекам-установай, ініцыятарам і будаўніком Беларускага музея ў Гайнаўцы". Уласнікам музея не можа быць толькі БГКТ, хаця БГКТ з'яўляецца ўласнікам пляца, на якім стаіць музей. Думаю, што найлепшай арганізацыйнай формай для існавання музея быў бы фонд як сукупнасць усіх арганізацый і асяроддзяў беларусаў, якія ўнеслі б у яго ўсе матэрыяльныя рэсурсы. Фонд Беларускага музея існаваў бы як самастойны быт з магчымасцю вядзення гаспадарчай дзейнасці. У склад наглядальнай рады ўваходзілі б прадстаўнікі ўсіх членаў фонду, а штодзённым кіраваннем працай фонду займалася б праўленне, у склад якога ўваходзілі б мясцовыя вопытныя дзеячы. Адным словам Беларускі музей, які ўжо стаіць у Гайнаўцы, не можа быць уласнасцю ні БГКТ, ні Грамадскага камітэта пабудовы, ні нейкай прыватнай асобы. Усе, каму ляжыць на сэрцы гэтая справа, павінны публічна аднесціся да маёй прапановы (або прапанаваць штосьці іншае).

Здзейсніць прапанову можа цяперашні Грамадскі камітэт пабудовы, які падрыхтаваў бы ўсе патрэбныя дакументы для рэгістрацыі ў судзе Фонду Беларускага музея.

А так пры нагодзе хацеў бы я запытаць, чаму не пытаўшы нікога Галоўнае праўленне БГКТ і Грамадскі камітэт пабудовы Музея незалежна (? — М. К.), у дэмакратычным галасаванні прынялі пастанову, што музей будзе дзяржаўнай установай без перадачы яго дзяржаве на ўласнасць, а ўласнікам аб'екта пасля заканчэння яго будовы будзе БГКТ? Пры чым тут дэмакратычнае галасаванне, калі адна

арганізацыя прыдумала, што можа прыняць на ўласнасць будынак, які паўстаў са сродкаў усіх беларусаў, не толькі членаў БГКТ? Мы тут у Гданьску можам таксама сабрацца і дэмакратычна перагаласаваць, што будынак будзе ўласнасцю гданьскіх беларусаў. А варшаўскія ж беларусы горшыя?

Андрэй Гаўрылюк з Ольштына таксама дэмакратычна можа пераняць будынак для мазурска-прускіх беларусаў.

**Міхась Куптэль**
21.01.1996

## Весткі з Музея

Ці існуе беларуская нацыянальная меншасць на тэрыторыі Польшчы?

Ці ёсць культурны цэнтр гэтай меншасці?

Ці ведаюць пра нас у свеце?

На ўсе гэтыя пытанні можна адказаць аднaзначна: „Так, так і так!” Ёсць меншасць беларуская, культурным цэнтрам якой з'яўляецца Музей беларускай культуры ў Гайнаўцы. Зацікаўленасць жа гэтым настолькі вялікая, што наш Музей наведваюць не толькі беларусы і палякі. Нацыянальнымі меншасцямі цікавяцца ў цэлым свеце, напрыклад, 16 верасня г.г. наш Музей наведалі госці з Кітая. Сярод іх быў Хэ Хонг Шанг, прафесар Пекінскага універсітэта, загадчык кафедры этнічных і нацыянальных меншасцей свету. Госці з Азіі былі вельмі зацікаўлены нашай культурай, этнаграфіяй, традыцыямі. Яны былі прыемна здзіўлены, што нягледзячы на ўсе фінансавыя цяжкасці, удаецца нам трымацца на высокім узроўні. Гасцей з Кітая суправаджаў праф. С. Шынкевіч з Інстытута археалогіі і этнаграфіі Польскай акадэміі навук у Варшаве.

Другім цікавым госцем быў студэнт з Англіі Алістар Рабагліяці, які наведаў наш Музей 19 верасня г.г. Піша ён доктарскую дысертацыю аб праблемах нацыянальных меншасцей у Польшчы. Ён таксама быў вельмі зацікаўлены тым, што мы робім. Гэтая зацікаўленасць была настолькі вялікай, што госць правёў у нашым Музеі цэлы дзень. Ён агледзеў залы, у якіх выстаўлены экспанаты, бібліятэку, а большасць часу правёў у размовах з працаўнікамі Музея. Цікавіла яго ўсё, што звязана з беларусамі, іх гісторыяй, культурай, этнаграфіяй. Але адзін дзень гэта вельмі мала, каб расказаць аб Беларусі і беларусах, таму

Алістар Рабагліяці збіраецца зноў прыехаць да нас на цэлы тыдзень, каб пазнаць наш народ больш дакладна.

Цешыць нас тое, што хоць наш Музей яшчэ да канца не збудаваны, ён становіцца з кожным днём усё больш вядомы.

**Наталля Герасімюк,**
бібліятэкар Музея
11.10.1998

## Мая сям'я — беларускі народ

Сяджу і думаю, а словы не кладуцца на паперу. Розныя думкі ідуць у галаву. Разважаю аб самым блізкім: аб беларускім народзе. Я — маленькая часцінка гэтай вялікай сям'і і гэтым ганаруся.

На парозе новага тысячагоддзя хочацца смела глядзець у будучыню, верыць у яе светласць. Але ці магчыма гэта, калі пачынаем забываць родную бацькоўскую мову, страчваць сваю духоўнасць?

Кожны з нас павінен памятаць, што маем абавязак захаваць і пакінуць сваім нашчадкам атрыманае ад продкаў. Будучыня — гэта паслядоўнасць нашых сённяшніх спраў, учынкаў, імкненняў, жаданняў і думак. Памятайце, паважаныя сябры, што будучае пачынаецца сёння. І калі ў будучыню нельга зазірнуць, то можна паўплываць на яе сваімі ўчынкамі і справамі.

З вялікай пашанай схіляю галаву перад Кастусём Майсенем і Аляксандрам Баршчэўскім, якія сваім розумам сягнулі далёка наперад і вырашылі пабудаваць у Гайнаўцы музей беларусаў усяго свету. Пачатая імі ў 1984 г. ідэя, пры падтрымцы айчынных і замежных беларусаў, здзейснілася — музейны будынак гатовы. Сёння трэба тэрмінова вырашыць якім павінен быць музей.

Музей павінен служыць нашай бацькаўшчыне. Многія могуць спытаць: што такое бацькаўшчына? Адказ просты — гэта ўсё тое, што вакол нас, што ў нас саміх. Гэта родныя палеткі, дарогі, сцяжынкі, што вядуць да роднага парога, да магіл родных. Гэта дом, з якога выйшлі мы ў шырокі свет, а ў ім — усё знаёмае да драбніцы: лыжкі, міскі, калыска, стол на покуце пад абразамі з хлебам накрытым белым ручніком. І родная мова. Усё гэта трэба бараніць. Але ці мы гатовыя на такую справу? Ісці нам трэба смела, не аглядаючыся. Калі аглянемся, пішы прапала.

**Віктар Бура**
22.02.2004

## Яшчэ пра музей

Наталля Герасімюк („Ніва”, ад 1.02.2004 г.) звярнулася да беларусаў, між іншым, з пытаннем „як удыхнуць жыццё” ў велізарны будынак музея. Помню паламіку на старонках „Нівы”, звязаную з пабудовай беларускага музея ў пачатку, бадай, васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Цяпер ставіцца пытанне, што зрабіць з такім агромністым будынкам, калі тады было вядома, што ў Гайнаўцы няма каму прафесійна весці музейную ўстанову. Каб гэта прадбачыць, не трэба было выказвацца вялікай пранізлівасцю. Калі так, дык можна сказаць, што калі наварылі такога піва, дык піце, таварышы, яго самі. Шкада толькі тысяч долараў ахвяравальнікаў з усяго свету, пры дапамозе якіх паўстаў „даўгабуд”. Дзесяцігоддзямі „Ніва” друкуе спісак ахвяравальнікаў, але ні разу не ўдалося мне прачытаць, як былі расходаваныя гэтыя, як не кажы, але грамадскія грошы. Пішу пра гэта, бо калі чытаю ў допісе Юркі Харкевіча „Якім быць музею ў Гайнаўцы” пра фінансавы балаган, дык не дзіўна, што „гэта ўсё не стварала добрай атмасферы вакол Музея”. Ю. Харкевіч піша далей, што „будуючы забыліся — мы ўсе — пра яго ідэю”. Не ўсе, спадар Харкевіч, не ўсе. І яшчэ адна праўда, якую трэба сабе ўсведаміць: ніколі вялікі будынак Беларускага музея не будзе цэнтрам культуры беларускай меншасці. Чаму? — часткова на гэтае пытанне адказвае аўтар допісу. Каб у Беластоку, пэўна так, хаця толькі 7 434 жыхары горада прызналіся да беларускасці, але патэнцыял куды большы чым у Гайнаўцы, ну і кадры, якія ўсё вырашаюць, як нехта казаў.

Некалькі дзён таму аглядаў я старонку www.hajnowka.pl у Інтэрнэце і пра беларускі музей ёсць там адзін сказ, што такі існуе. Нічога пра беларусаў, беларускасць, культуру, адметнасць рэгіёна і г.д.

А так пры нагодзе, спадар Харкевіч, думка, каб пры Музеі заснаваць эстраду, гэта ўжо зусім кур’ёз. Хіба, што музейную. З тым згаджаюся. Музейных эстраднікаў не так ужо і мала.

**Міхась Куптэль**

25.04.2004

## Пры свяце хлеба

Свята беларускага хлеба мела адбыцца на музейным панадворку. Калі ж надвор'е неадпаведнае, мерапрыемства адбываецца ў музейным будынку. Ён вялікі, прыгожы, ужо даволі акуратна добраўпарадкаваны. Пры такіх нагодах адкрыты таксама музейныя залы, у якіх усё тут тутэйшае, нашае, беларускае. Ды і будынак з панадворкам нашы. У ім працуе таксама Цэнтр беларускай культуры ў Польшчы.

Свята беларускага хлеба адбылося ў будынку, бо было кепскае надвор'е — увесь дзень ішоў дождж. Відаць таму і людзей было мала. Шкада, бо ўрачыстасць атрымалася хвацкая і праведзена была спраўна.

Распачала і вяла яе працаўніца музея Наталля Герасімюк. Ролю гаспадара, як і павінна быць, выконваў дырэктар музея Янка Карпюк. Ён і абтанцоўваў артыстак, і яго перавязалі жытнім пярэвяслам наканец. Міхал Голуб скупою рукою дзяліў і дарыў хлеб і булку народу. Былі заняты і іншыя працаўнікі музея.

Абрадныя сцэнкі, прысвечаныя хлебу, паказаў жаночы калектыў з Беларусі і нашы „Арэшкі". На сцэне было паказана прыгожае, свойскае, роднае і дарагое. Адным словам, малайцы! Потым прыгожа выступіў маладзёжны калектыў з Мінска.

І проста ў каторы ўжо раз дзіву даешся, чаму ўлады Беларусі і эліта яе не адчуваюць гэтай прыгажосці, не шануюць яе і не разумеюць выхаваўчага значэння роднай беларускай мовы і традыцый для патрыятычнага выхавання сваёй нацыі?!

Другая мая рэфлексія: як гэта добра, што мы нарэшце маем свой уласны будынак, свой музей, сваю бібліятэку, архіў... Яны павінны добра прыслужыцца як нашаму сучаснаму і будучым пакаленням, так і захаваць добрую памяць пра нашы мінулыя тут пакаленні. Яны і мы заслужылі гэтага.

А давялося ўсё гэта няпроста і не адразу, бо спрыяльных умоў для гэтага ў нас замнога яшчэ не было. Усё гэта стваралася на маіх вачах і канешне ж і пры маім актыўным удзеле. Думаю, найбольшае дзякуй належыцца тут Канстанціну Майсеню і гайнаўскаму актыву. Гэта яны найбольш старанняў прылажылі пры арганізацыі музея і фізічнай працы пры яго пабудове. Калі толькі было трэба, ішлі самі і вельмі часта мы, настаўнікі, вялі сваіх вучняў. Працы хапала

ўсім. Найбольш працавалі пры музеі, канешне, вучні Гайнаўскага белліцэя, але даволі часта працавалі і вучні з прафесіянальнай школы. Іх прыводзіў і кіраваў імі Мікалай Нікалаюк. Быў ён вельмі актыўным дзеячам і моцна прыслужыўся стварэнню музея. Вечная Яму памяць! На жаль, няма ўжо і Аляксандра Іванюка, і Сяргея Харкевіча ды іншых былых дзеячаў. Канстанцін Майсеня цяжка хварэе.

Надалей рэгулярна наведвае музей і, калі толькі трэба, дапамагае Аляксей Харкевіч. Добрую, „фаховую" работу выконвае ў музеі Віктар Кабац.

**Васіль Сакоўскі**
28.08.2005

# СУПОЛЬНАСЦЬ У ЛІТАРАТУРЫ

## „Карткі" ў Гайнаўцы

Першы сёлетні нумар літаратурна-мастацкага часопіса „Kartki" дайшоў ужо і ў Гайнаўку. 15 сакавіка г.г. у Гарадской бібліятэцы адбылася прамоцыя гэтага выдання з удзелам Багдана Дудко і Міколы Ваўранюка. На пачатку мерапрыемства вучні мясцовага беларускага ліцэя Мацей Сніткоўскі, Юліта Адамюк і Тамаш Саевіч у поўнай настрою атмасферы чыталі паэзію Алеся Разанава. Паэтычнасці бібліятэчнай зале з кніжнымі паліцамі прыдавалі развешаныя па ўсім памяшканні чыстыя карткі паперы і цьмянае святло. Бібліятэка падрыхтавала адмысловую выстаўку, прысвечаную „Карткам".

Багдан Дудко і Мікола Ваўранюк пазнаёмілі сабраных з навейшым нумарам выдання, у якім многа месца адведзена сучаснай беларускай літаратуры і адказвалі на пытанні публікі. А ў зале сабралася некалькі дзесяткаў чалавек, сярод якіх была і бурмістр горада спадарыня Ядвіга Рудзінская-Патэюк. Выказала яна вялікае прызнанне для стваральнікаў „Картак", асабліва за комплексны падыход да беларускай культуры на старонках часопіса (прэзентуюцца ў ім літаратура, музыка, мастацтва, фатаграфія). На заканчэнне бібліятэкары падзякавалі галоўнаму рэдактару „Картак" Багдану Дудко і падаравалі яму паэтычны зборнік „Zapisać siebie", выдадзены ў 1995 годзе Таварыствам любіцеляў Гайнаўкі і Гарадской публічнай бібліятэкай.

**Славамір Кулік**
20.04.1997

## Беларускі вечар у Варшаве

Аўтарскі вечар Алены Анішэўскай і Дзмітрыя Шатыловіча, названы „беларускім вечарам", адбыўся ў Асяродку культуры славянскіх народаў у Варшаве 15 лютага 1999 г. Невялікая зала бібліятэкі ледзь памясціла каля 40 асоб, пераважна знаёмых з колішніх частых сустрэч у сценах беларускага клуба. Спатканне ўдастоілі саветнік пасольства РБ Міхал Бацян і перакладчык беларускай літаратуры на польскую мову Чэслаў Сэнюх.

Прафесар Васіль Белаказовіч, які прыняў на сябе абавязак гаспадара вечара, прыблізіў прысутным асобы аўтараў, іх паходжанне і жыццёвы шлях. Звярнуў увагу на сувязь перажытага імі з іх творчасцю, тыповай для этнічнага памежжа.

Чытанне і дэкламацыя вершаў Аленай Анішэўскай, з яе зборніка „Смак жыцця", выдадзенага ў 1998 г. на беларускай і польскай мовах, ды кароткія каментарыі выклікалі прыхільнасць, выяўленую, перш за ўсё, жанчынамі ў сітуацыйных заўвагах. У змесце зборніка сапраўды праяўляецца шырока зразумелы смак, калі не сказаць культ жыцця, повязь з роднаю прыродаю, паэтычнае бачанне яе красы, цеснае з'яднанне з ёю. „Мне не ўсё роўна, дзе жыву я. Ды ў неабудны адыду спачын", — піша паэтэса.

У сваіх вершах, характэрных рэфлексіўнасцю, Алена Анішэўская не раскідаецца лішняй метафарай. Карыстаецца ёю па меры неабходнасці мастацкага выяўлення вобразу альбо ў выпадку вельмі асабістых інтымных пачуццяў, як, напрыклад, у вершы на польскай мове „Nadzieja", дзе цэлы верш з'яўляецца фактычна метафарай. Падгляданне жыцця, выснова з гэтага назірання выяўляецца ёю, між іншым, у паэме „Наш Парнас" з намераным пераймannем манеры „Тараса на Парнасе", дзе гумарыстычна адлюстроўвае яна „белавежскі" парнасік. Паэзія Алены Анішэўскай уфармаваная пад уплывам тае — з палавіны стагоддзя — аб'явілася ў традыцыйным, з тых гадоў, стылі і форме, ад якой аўтарка паступова адыходзіць у карысць сучасных формаў верша, у тым ліку — вольнага, а колькасць свайго пісання выразна падпарадкоўвае яго літаратурнай якасці.

Дзмітры Шатыловіч сустракаўся не раз ужо са сваімі чытачамі ў прошлым. Ён з жорсткай паслядоўнасцю прытрымоўваецца тра-

дыцыйнага стылю і формы рыфмавання верша. Паэзія яго характэрная апісальнасцю і дакладнасцю ў выражэнні думкі адпаведна тэхнічнаму інтэлігенту, якім, па прафесіі, з’яўляецца інжынер Д. Шатыловіч. Прачытаныя ім у час сустрэчы вершы са зборніка „Эцюды падарожжа”, выдадзенага ў 1992 годзе і „Маё Падляшша” ад 1993 года, прыводзяць на думку дзве галоўныя высновы. Перш за ўсё, маюць яны пазнаўчае значэнне з галіны геаграфіі, гісторыі, у тым ліку старажытнай, пераказаны чытачу ў літаратурнай форме ў выніку турыстычных падарожжаў аўтара.

Паэзія „Майго Падляшша” з’яўляецца дакументам, які адлюстроўвае ўмовы жыцця рэгіёна, яго прыроду, культуру, цэлы перыяд пакалення аўтара.

Абодва згаданыя элементы паэзіі Д. Шатыловіча ўнушаюць мэтазгоднасць распаўсюджвання яе сярод школьнай моладзі, дзеля абгрунтавання здабываных у школе ведаў і (у другім выпадку) разбуджэння эмацыянальных адносін да сваёй малой айчыны.

На заканчэнне Чэслаў Сэнюх падзяліўся ўражаннямі ад падарожжа ў Мінск і ад імя кіраўніцтва Міжнароднай Еўра-Азіяцкай акадэміі навук уручыў прафесару Васілю Белаказовічу дыплом члена гэтай Акадэміі. Прысутныя павіншавалі прафесара воплескамі.

**Янка Жамойцін**

14.03.1999

## Супольнасць у культуры

Пад такім лозунгам ужо дванаццаты раз адбыўся ў Варшаве агляд культурнай актыўнасці нацыянальных і этнічных меншасцей у Польшчы. Мерапрыемства праходзіць пад патранатам высокапастаўленых асоб. Сёлета патранат трымаў міністр культуры Вальдэмар Дамброўскі.

23 кастрычніка, у рамках агляду, у Славянскім цэнтры па вул. Гагарына 15, адбыўся аўтарскі вечар беларускіх паэтаў: Галіны Тварановіч і Яна Чыквіна. Імпрэзу вёў праф. Васіль Белаказовіч, эрудыт і выключны знаўца славянскіх літаратур. Прысутных было больш за 40 асоб. Мерапрыемства ўдастоілі пасол Рэспублікі Беларусь Павел Латушка, саветнік пасольства Мікола Пятровіч ды паэт і перакладчык Чэслаў Сэнюх. Не падвялі навуковыя супрацоўнікі Беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і дзеячы БГКТ, тыя, якія заўсёды знай-

дуць час паслухаць роднай беларускай мовы.

Пасля прэзентацыі твораў завязалася дыскусія аб творчасці „белавежцаў”. Прысутныя заўважылі, што ў творах Галіны Тварановіч паявілася духоўна-рэлігійная тэматыка, чаго дасюль не назіралася ў нашых творцаў. Калі і была дык не экспанавалася, быццам непатрэбная ў той час. Праф. Ян Чыквін сказаў, што творчасць „белавежцаў” разнародная і можна знайсці творы з такім ухілам. Чэслаў Сэнюх зачытаў рэлігійныя вершы Рыгора Барадуліна. І гэта быў доказ таго, што ў беларускай літаратуры сённяшняга часу можна знайсці розныя плыні. Глыбока філасофская паэзія Яна Чыквіна дачакалася ўжо належнай ёй ацэнкі не толькі ў нас, але і ў Беларусі (навуковая дысертацыя аб яго творчасці) і ў іншых краінах.

Аўтарскі вечар не адзіны беларускі акцэнт у рамках мерапрыемства „Супольнасць у культуры”. 25 кастрычніка ў варшаўскім квартале Урсус выступілі калектывы з песнямі і танцамі, між іншым, яўрэйскі, нямецкі, цыганскі. Але нашыя „Васілёчкі” з Бельска пакарылі ўсіх. Па-першае (як сказала мне адна асоба, якой ад захаплення дух заняло) гэта не аматарскі калектыў, але высокапрафесійныя артысты. Дасканалыя касцюмы і харэаграфія ды такія ж галасы захапілі публіку. Давялося некалькі разоў выступаць на біс. Канферанс на беларускай мове быў зразумелы ўсім.

За пашырэнне беларускай культуры ў Польшчы, падзякаваў ім саветнік Пасольства Беларусі Мікола Пятровіч.

**Алена Анішэўская**
16.11.2003

## Юбілей паэта

15 красавіка 2005 года ў Цэнтры славянскай культуры ў Варшаве ў прыўзнятай атмасферы адбылася сустрэча, прысвечаная паэтычнай творчасці Віктара Шведа.

Гэтую атмасферу надзвычайна стваралі праф. Васіль Белаказовіч, выдатны знаўца паэзіі Віктара Шведа, і сам паэт.

У аўры сустрэчы не маглі не нараджацца ўспаміны і рэфлексіі. Паэтычная творчасць Віктара Шведа гэта эпоха. Яшчэ ў 1946 годзе, мы, вучні гімназіі, ведалі яго імя.

Паэзія Віктара Шведа адзначаецца свежасцю бачання і вытанчанасцю выражэння. З’яўляецца ён надзвычай цёплым лірыкам. Яго

слова кранае душу надта мякка, быццам шоўк цела.

Паэт з'яўляецца свайго роду храністам. Вобразы рэчаіснасці, апраўленыя ў рэальныя паэтычныя ўбранні, з'яўляюцца непрамінальнымі. Тут няма нічога з манеры, пустой ігры слоў, з попелу якой нічога нельга расшыфраваць.

Да гэтай паэзіі Віктара Шведа, нязгаснага полымя душы, людзі будуць звяртацца заўсёды.

**Барыс Руско**
8.05.2005

# БАЛЮЧАЕ МІНУЛАЕ

## Не магу зразумець

Калі пачуў я па Радыё Беласток беларускую перадачу Юркі Ляшчынскага, падумаў і сказаў: „Дзякуй табе за гэта, што крануў справу загінуўшых вазакоў з Гайнаўшчыны. Можа некаторыя першы раз аб гэтым пачулі, а некаторыя, мабыць, забылі".

Было гэта ў 1946 годзе. Людзі яшчэ не прымірыліся з тым, што ім прынесла вайна. Адны разграбалі папялішчы, другія аплаквалі блізкіх, якіх забрала вайна. Памалу людзі прывыклі да пасляваеннай сітуацыі і нясмела глядзелі ў будучыню. Пыталі самі сябе: а што далей? якая ўлада? што будзе з намі? Вядома, беларусам ніколі добра не было. Хаця жывем на сваёй зямлі, лічымся чужымі. Беларусы заўсёды непатрэбныя былі.

Хадзілі чуткі пра банды. Там-сям нападалі яны на спакойных людзей, мардавалі, палілі. Не адзін з гневам казаў: „Мала ім вайны было. Не наваяваліся!" Аднак тут справа не ў вайне была. Новай улады яны не хацелі. І вось у такі час некалькі дзесяткаў сялян выслалі ў лес па дровы. Людзі паехалі і прапалі, як камень у ваду. Былі гэта сяляне з Чыжоў, Ягаднікаў і другіх вёсак.

Час зрабіў сваё, блізкія аплакалі бацькоў, сыноў і братоў. Усё прыціхла. Гаварылі, што войска іх забрала, вазакамі сваімі зрабілі. Аднак час праходзіў, а яны не вярталіся. Потым гаворка пайшла, што памардавала іх банда „Бурага". Нямала такіх бандаў пасля вайны бадзялася. Улада ўжо замацавалася, а яны яе не хацелі, спакойным людзям не давалі адпачыць ад жахаў вайны.

І вось столькі спатрэбілася часу, каб успомніць аб прапаўшых

вазаках. Кажуць, душа чалавечая бясследна не прападае. Мяне надалей турбуе пытанне: чаму ў цывілізаваным свеце трэба аж некалькіх дзесятак гадоў, каб даведацца, што здарылася з людзьмі? У канцы выявілася як яны загінулі. Аднак ніхто з уладаў слоўцам не прамовіў, спачуванняў сем'ям загінуўшых не выказаў. Відаць, хочуць усе канцы патапіць у вадзе. Выглядае, што так трэба было. Калі пайшла адліга, пачалі шукаць прапаўшых і даходзіць, хто вінаваты.

Моднымі сталі эксгумацыі. Астанкі з усяго свету ў Польшчу прывозяць, толькі беларусам нельга. Беларусы — другі гатунак людзей. Блізкія памардаваных вазакоў самі заснавалі свой камітэт, стараюцца астанкі памардаваных перавезці бліжэй сваіх мясцін, каб час ад часу можна было памаліцца на магіле і свечку паставіць. Аднак усё каштуе. А ўладам гэта непатрэбнае, грошай няма. На справу беларускіх вазакоў грошай шкада. Яшчэ кажуць, што памардавалі вазакоў, бо вайна была і брат брата забіваў. Толькі гэта якраз сталася пасля вайны. І цікавіць яшчэ адно: чаму банда так многа братоў мела сярод беларусаў? А цяпер не асталося хаця аднаго, які братам-беларусам дапамог бы. На жаль, у беларусаў няма братоў сярод палякаў. Каб былі, тады ўсе справы пайшлі б інакш. А тут выглядае, што беларусы ў Польшчы жывуць як сіроты. Нікому яны непатрэбныя, не пачуюць яны ласкі і ніхто іх не любіць. А мне здавалася, што Польшча — гэта адзін прыгожы букет кветак, які складаюць усе нацыянальнасці, якія пражываюць у ёй і маюць аднолькавыя правы. Аднак, не! Некаторыя хочуць непатрэбныя кветкі з букета выскубці, кінуць іх у яму, або ў папялішча. Непатрэбныя кветкі ў букеце не пахнуць.

Пыталі ў міністра па ветэранскіх справах, чаму тыя, што пасля вайны мардавалі мірных людзей, атрымліваюць пэнсіі і ветэранскія дадаткі. Адказаў ён, што такі закон і адмяніць яго можа толькі сейм. Блізкія памардаваных нічога не зробяць, яны ж і прадстаўнікоў сваіх у сейме не маюць. Адабраць дадаткі аднак можна было толькі тым, што банды разбівалі. А тыя, што даўней былі ворагамі ўлады, цяпер сталі героямі. Іх цяпер паважаюць і ўзнагароджваюць. Аднак чалавеказабойцы, кім бы яны не былі, павінны быць асуджаны. Многа яшчэ ў нас такіх нявырашаных балючых спраў, і рашыць іх няма каму.

**Грыша Мароз**
6.04.1997

## Аб подзвігах „Бурага"

Кожны народ дбае аб сваім гонары, стараецца весці адпаведную палітыку, падтрымоўваючы карэктныя адносіны з суседзямі і фарміруючы такім чынам маральны воблік грамадства. Тое, што сапраўднасць ззяючых на сцягах лозунгаў не заўсёды пацвярджаецца гісторыяй, паказвае наколькі палітыка бывае нядобрасумленнай. А тое, што мэта апраўдвае сродкі — гэта звычайная фраза, якая не ўлічвае прынцыпу бумеранга.

Моладзь выносіць са школ перакананасць, што польскі народ заўсёды быў надта талерантны, глыбока рэлігійны, адным словам — амаль выбраны самім Богам. Таму менавіта мала хто паглыбляецца ў сівую мінуўшчыну. А ў гісторыі бывала ўсяляк. У свой час ахвотна і з жаднасцю імкнуліся праглынуць Вялікае княства Літоўскае, акаталічыць і апалячыць яго грамадзян, а нежадаючых пакінуць праваслаўе бесцырымонна праследавалі. Язафат Кунцэвіч нават загадаў памерлых у гэтай веры выкідаць на звалку, без пахавання. Што ж, гэты перыяд гісторыі завяршыўся падзеламі Рэчы Паспалітай.

У навейшым мінулым — далейшы працяг гісторыі. Якое ж было замяшанне, калі ў Парыжы выйшла кніга Юзафа Мацкевіча „Не трэба голасна гаварыць", у якой, між іншым, апісваліся „подзвігі" некаторых фарміраванняў АК на былых крэсах. Мяркую, што рэакцыя была падобнай на тую, якая нядаўна ўспыхнула пасля абнародавання фактаў з Ядвабнага, Кельцаў і іншых.

Людзі, калі вераць, што высакароднасць дадзена ім Богам, нават не стараюцца заўважыць, што ў мітусні падзей паняцці гонару, праўды не адпавядаюць „гонару" некаторых кіруючых колаў у краіне. Не цешма сябе марамі, паколькі даказванне праўды пры дапамозе хлусні раней ці пазней пагражае кампраметацыяй. Шкада, што кампраметацыя найчасцей прыходзіць запозна. Калі сёння чытаю ў „Ніве" (№ 33) аб пратэсце супраць называння злачынствам учыненых атрадамі Рамуальда Райса забойстваў (зніштажэнне сялян праваслаўных вёсак, спаленне жывымі дзяцей), здзіўляюся. Ваенны суд, што моцна падкрэслівае падляшскі ваявода, рэабілітаваў абвінавачаных у забойствах! У колькіх жа іпастасях права і мараль могуць выступаць у нашай хрысціянскай краіне?

З маіх разважанняў узнікае пытанне: ці выпадкова подзвігі „Бу-

рага" не адабраюцца некаторымі ўладнымі коламі і ці зніштажэнне праваслаўных на заходніх рубяжах ВКЛ не было накінутай зверху задачай для яго атрадаў? Для публічнага дабра! Справа забітых рыцарамі Рамуальда Райса цягнецца паўвека і ўсё напатыкае перашкоды ў яе канчатковым вырашэнні. І яшчэ адно пытанне: ці сем'і забітых атрымалі нейкія кампенсацыі? Улады, якія выступаюць у ролі абаронцы АК, гэты абавязак таксама павінны ўзяць на сябе. Хіба, што гэтую сумную справу перадаць Міжнароднаму трыбуналу ў Гаазе дзеля паскарэння яе вырашэння. Чарговых дзесяткаў гадоў сем'і забітых могуць не дачакаць.

**А. М.**

(прозвішча і адрас да ведама рэдакцыі)

9.09.2001

## „Героі" і „бандыты"

Абодва гэтыя паняцці пазначыў я двукоссем, бо ў сапраўднасці было інакш, чым сёння пішуць і расказваюць у школах дзецям. Цяпер усюды пачуеш як за дэмакратычную Польшчу змагаліся ўзброеныя аддзелы AK-WiN і NSZ пасля заканчэння II сусветнай вайны і як народная ўлада іх за гэта мардавала. Затое ніхто, апрача мяне, нідзе ні разу не заікнуўся, што гэтыя „героі" ў час вайны не пайшлі памагаць антыгітлераўскай кааліцыі дабіваць фашыстоўскіх агрэсараў у Берліне. А наадварот, памагалі немцам біць тых, хто з пад Леніна ішоў, каб супольна з Савецкай Арміяй вызваляць Польшчу.

Прачытаўшы артыкул Яўгена Мірановіча „Праўда пра герояў" („Ніва" н-р 50 за 2002 год), не мог я вытрываць, каб не адазвацца, хаця ўжо не адзін раз пагражалі мне, што пашкадую таго, што пішу. Раз на вуліцы аддубасілі мяне, а пасля па тэлефоне абяцалі зрабіць са мною тое, што з Чаўшэску, калі не перастану пісаць „tych bandyckich kłamstw".

А мне хочацца запытаць, ці „бандыты" дзяржаўнай бяспекі легальнай улады ў час арышту члена нелегальнай арганізацыі, або супрацоўніка гэтай арганізацыі арыштоўвалі ягоную сям'ю і палілі хату? А „барацьбіты" за польскі народ не пашкадавалі спаліць малых дзяцей з іх бацькамі і хатамі. І то без ніякіх асноў. Не, больш пытанняў не будзе, бо адзін прыклад адносін сённяшніх улад і каталіцкага кліру да „герояў" і „бандытаў" заладзіць усё. Помнік АКаўцам у Вар-

шаве пасвяціў папа Ян Павел II, а памардаваным тымі ж „героямі" праваслаўным „бандытам" з вялікімі цяжкасцямі толькі цяпер удалося паставіць на магільніку ў Бельску-Падляшскім сціплы помнічак.

Інстытут нацыянальнай памяці арганізавалі толькі на тое, каб судзіць „бандытаў" ПНР, а „герояў" з лесу ачысціць з усіх злачынстваў. Сябра ІПН у Нараўцы сёлета сказаў, што: „Owszem, były wyroki śmierci, ale tylko na tych, którzy biegali do radzieckich władz, aby Białostocczyznę dołączyć do BSRR i na agentach bezpieki". Яны проста нічога не саромеюцца?

**Васіль Петручук**
12.01.2003

## Герой ці злачынца?

З лістапада на першым тэлеканале публічнага тэлебачання дэманстраваўся дакументальны фільм Агнешкі Арнольд „Bohater", аб Рамуальдзе Райсе, псеўданім „Буры". Рашэннем суда ў 1947 г. „Буры" быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. У 1995 г. яго рэабілітавалі. У Браньскай гміне ўзведзены яму помнік. У памяці жыхароў усходняй Беласточчыны „Буры" бачыцца як злачынца. Гэта ён са сваім атрадам пазбавіў жыцця вазакоў з Лазіцаў ды спаліў вёскі Залешаны і Зані.

Аўтарка фільма прыводзіць успаміны былых салдат „Бурага" і сем'яў ахвяр.

Хачу затым паставіць пытанне ў адрас Інстытута нацыянальнай памяці: як бачаць справу рэабілітацыі Рамуальда Райса і хто ён у сапраўднасці: герой ці злачынца? Факты і дакументы сведчаць аб гэтым другім. Хочацца, каб у нашай дзяржаве ўсё называлася сваімі імёнамі. Гісторыю нельга фальшаваць. Яна павінна заўсёды заставацца праўдзівай.

**Уладзімір Сідарук**
23.11.2003

## Дошка гісторыі

На цэнтральнай плошчы Боцькаў, ля шумнай шашы з Бельска ў Сямятычы, стаіць мала заўважальны помнік з палявых камянёў з дзвюма „галоўнымі" мемарыяльнымі дошкамі. Пацікавіўся я незвычайным помнікам — і не шкадую гэтага. Да гэтай пары я не сустрэў такога прыкладу культуры і такту ў падыходзе да трохі кла-

патлівай спадчыны па мінулай эпосе. А вось змест першай шэрай бетоннай таблiцы:

„У XV гадавіну заснавання Грамадзянскай міліцыі. У гонар загінуўшых функцыянераў міліцыі ў барацьбе з бандамі за ўмацаванне народнай улады ў 1944-1947 гг. Грамадства Бельскага павета, 7 XI 1959”.

Гэтую дошку трохі перасунулі з цэнтральнага месца ўбок так, каб побач памесцілася другая табліца — з чорнага элегантнага каменю. Угары новай дошкі віднеецца выява Крыжа і Арла ў кароне, а пад імі вось такі тэкст:

„Помнік гэты паходзіць з перыяду, у якім насілле лічылася мужнасцю, а цнота і патрыятызм былі рэліктам мінулага. Змагарам за дэмакратыю — грамадства Боцькаўскай гміны. 3 V 1990”.

Помнікі ствараюць гісторыю. Ведаюць аб гэтым у Парыжах і Рымах. Толькі ў Польшчы кожная новая палітычная фармацыя пачынае з разбурэння слядоў папярэднікаў. У Боцьках умелі парваць з гэтым заганным звычаем — і вельмі добра. Зроблены маленькі крок у бок нармальнасці.

**Марк Цыбарт**
29.02.2004

# ЭКУМЕНІЯ НА ПРАКТЫЦЫ

## Экуменія і Супрасльская лаўра

У студзені гэтага года ў беластоцкіх храмах праводзіліся шматлікія багаслужбы дзеля ўз’яднання хрысціян. Касцёлы і цэрквы былі запоўнены вернікамі розных канфесій — каталікамі, праваслаўнымі, уніятамі. Прысутныя мелі магчымасць пачуць з вуснаў іерархаў і святароў меркаванні наконт раз’яднання хрысціянскай веры. Я асабіста прысутнічаў у набажэнствах у Фарным і Свята-Духавым касцёлах і Свята-Духавай царкве.

У Фарным касцёле праваслаўны святар а. Савіцкі надзвычай красамоўна гаварыў пра тое, як у штодзённым жыцці паміж праваслаўнымі і каталікамі складаюцца сапраўды хрысціянскія суадносіны. На мой погляд, пропаведзь мела больш тэарэтычны, чым практычны характар, паколькі бацюшка не назваў каго ён меў на думцы: простых жыхароў горада, сялян ці духоўную іе-

рархію? Айцец Савіцкі прамаўчаў справу змяншэння дзяржаўнай датацыі на адбудову Супрасльскага манастыра і паслядоўнасцей для іншых канфесій пасля ўступлення ў сілу канкардата. З вуснаў бацюшкі плылі толькі цёплыя словы.

У Свята-Духавым касцёле уніяцкі біскуп Ян Мартыняк выказваўся таксама памяркоўна, хаця крыўдаваў, што не ўсе грэка-каталіцкія цэрквы былі ім вернуты. Прасіў ён каталіцкіх іерархаў дазволіць яму часцей наведваць Беласток. Мне асабіста ўразіла багаслужба на ўкраінскай мове і прыгожыя спевы царкоўнага хору з Пярэмышля. Падумался мне тады: ці калі-небудзь мы, беларусы, пачуем у цэрквах багаслужбу на роднай мове? Зусім іншы характар мела выступленне архібіскупа Станіслава Шымэцкага, які спачатку падзяліўся з вернікамі ўражаннямі ад пабыўкі ў папы Яна Паўла ІІ. Адказваючы біскупу Мартыняку, архібіскуп заявіў, што Беласточчына спакон вякоў была грэка-каталіцкай і што уніяты пабудавалі на гэтай зямлі многа храмаў, манастыроў ды асветных цэнтраў, якія пры царызме дасталіся праваслаўным. Тады менавіта была і ліквідаваная унія за кошт пашырэння праваслаўя. Аднак адкуль узяліся уніяты на Беласточчыне каталіцкі іерарх ужо не прыгадаў, затое не забыўся намякнуць, што Супрасльскі манастыр апошнім часам апынуўся ў руках незаконных уладальнікаў.

Як бачым, страсці вакол Супрасльскага манастыра не сціхаюць, нават падчас тыдня малітваў за еднасць хрысціян. Відаць, кожны па-свойму разумее экуменію.

**Ю. П.**

(прозвішча і адрас да ведама рэдакцыі)

29.03.1998

## Роздумы ў пачатку юбілейнага года

Седзячы ля экрана тэлевізара ў час каталіцкіх Каляд глядзеў я прамую трансляцыю з Ватыкана, калі папа Ян Павел ІІ сімвалічна адчыняў дзверы Базілікі св. Пятра. Падумалася мне тады: чаму ў гэтай урачыстасці не ўдзельнічаюць праваслаўныя іерархі? Ці ж праваслаўе горшае, менш хрысціянскае за каталіцызм?

6 студзеня г.г. у тэлевізійных навінах асвятляўся візіт праваслаўных першаіерархаў з розных краін свету ў Іерусалім. Ва ўрачыстым спатканні з нагоды 2000 юбілею хрысціянства прымалі ўдзел

прэзідэнты тых краін, у якіх праваслаўныя складаюць пераважную большасць насельніцтва. Сярод запрошаных былі прэзідэнты Расіі, Беларусі, Украіны, Малдовы, Грэцыі, Кіпра, Румыніі, Балгарыі і шэрагу іншых дзяржаў.

Малітоўная сустрэча праваслаўных першаіерархаў у Віфлеемскім храме Раджджаства Хрыстовага праходзіла ціха і спакойна. Я звярнуў увагу, што сустрэчы з каталіцкім першаіерархам, рымскім папам, адбываюцца ў зусім іншай атмасферы — у эйфарыйным настроі, якому спадарожнічаюць апладысменты, воклічы, транспаранты, быццам бы на дэманстрацыі.

У Іерусаліме Барыс Ельцын і Аляксандр Лукашэнка былі ўзнагароджаны Ордэнам Святога Крыжа Рыцараў Магілы Гасподняй. Гэты факт заставіў мне задумацца над тым, як чалавек можа служыць двум багам. У савецкі час былі яны не толькі атэістамі, а проста ворагамі рэлігіі. А сёння?

**Дзядзька Захар**
30.01.2000

## Любіце сябе ўзаемна

Нядаўна закончыўся Тыдзень малітваў за еднасць хрысціян. З гэтай нагоды ў Беластоку ў Свята-Духаўскай царкве маліўся каталіцкі мітрапаліт, а ў касцёле св. Войцеха — праваслаўны епіскап. У час малітоўных спатканняў іерархі перадалі сабе „znak pokoju”. Але на практыцы ад гэтага нічога не змянілася. Напрыклад, справа Супрасльскіх катакомбаў, якая па інспірацыі каталіцкага боку далей застаецца нявырашанай. Апошнім часам нават пастанова Гарадской рады ад 26 ліпеня 2003 г. аб перадачы іх Дабравешчанскаму манастыру была Адміністрацыйным судом адхілена.

Набліжаецца Вялікдзень. Сёлета католікі і праваслаўныя адсвяткуюць яго ў адным тэрміне. З гэтай нагоды іерархі Каталіцкага касцёла і Праваслаўнай царквы павіншуюць сябе ўзаемна, перакажуць найлепшыя пажаданні. Але ці будуць яны шчырыя? Хацелася б, каб „znak pokoju” быў перададзены над катакомбамі ў Супраслі. Няхай не будзе гэта „tajemnica wiary”, а сапраўдная любоў, згодна евангельскім словам: любіце сябе ўзаемна.

**Дзядзька Захар**
21.03.2004

## Экуменічныя крыжы

5 чэрвеня ў Альхоўцы на акраіне Белавежскай пушчы адбылася рэлігійная ўрачыстасць з удзелам праваслаўных і католікаў.

На канцы вёскі пад лесам мясцовая ўлада паставіла альхоўцам два дубовыя крыжы: праваслаўны і каталіцкі пад адной гарызантальнай перакладзінай. Больш такіх крыжоў нідзе не відна.

Калісьці людзі верылі, што хрысціянскі крыж бароніць мясцовасць ад розных няшчасцяў. У далёкім 1927 годзе жыхары Альхоўкі ў пачатку вёскі паставілі каменны крыж, які стаіць да сёння. Старажылы кажуць, што тады сяляне сабралі шмат грошай, каб заплаціць за работу майстру каменшчыку з Семяноўкі. Была гэта вартасць адной каровы. Цяпер жа, новыя крыжы дасталіся альхоўцам, так сказаць, дармова. Ініцыятарам і праектантам экуменічнага крыжа з'яўляецца пенсіянер Тадэвуш Кшыжаньскі, які пераехаў у Альхоўку з прыгожага Кракава. Вырашыў ён паставіць такі асаблівы крыж насупраць сваёй хаты. Надляснічы даў матэрыял, войт забяспечыў пабудову зямлёй і тратуарнымі пліткамі. Актыўна ўключыліся ў мерапрыемства солтыс і радны Альхоўкі.

5 чэрвеня праваслаўны і каталіцкі святары з Нараўкі сарганізавалі ўрачыстую працэсію і пакрапілі свянцонай вадой новыя крыжы. Потым усе ахвотныя сабраліся ў святліцы, дзе прадаўжалі бяседу з песнямі і танцамі да позняга вечара. Усе захапляліся панарамай старой вёскі, якую на сцяне былой школы цудоўна намаляваў Тадэвуш Кшыжаньскі. Ён па прафесіі мастак. Цікавы факт, што мастак Кшыжаньскі з'яўляецца прапраўнукам Дуніна-Марцінкевіча, класіка беларускай літаратуры. Бацькі Тадэвуша пасля вайны, у час рэпатрыяцыі, пераехалі з Міншчыны ў Кракаў. Пасля выхаду на пенсію Тадэвуш Кшыжаньскі пакінуў горад на Вісле і пасяліўся з жонкай у Альхоўцы каля лесу.

**Мікалай Варанецкі**
26.06.2005

# НАШЫ КАРАНІ

# У НІЎСКАЙ СЯМ'І

## „Патрыёты" адзін раз у год

Так можна смела назваць нашых людзей Беласточчыны. Перад Новым годам, а нават раней, усе жыхары нашых вёсак з маёй тэрыторыі масава просяць, каб даставіць ім навагоднюю „Ніву" з календаром, бо яны яе ахвотна купляюць. Такім я гавару:

— Дык „Ніва" да нас на пошту штотыдзень прыходзіць і калі ласка — купляйце яе, а я ахвотна прынясу ў вашу хату і яна нічуць не горшая ад навагодняй.

— О, не: такую я не куплю, бо я не ўмею чытаць па-беларуску і бедны — шкада грошай, — чую адказы нашых беларусаў.

Аж сорам бярэ за іх такія маналогі, за нелюбоў да роднага слова. Яны „бедныя", аднак на лішняе, як гарэлка ці судовыя справы грошай не шкадуюць. А ёсць і такія, якія кажуць, што „Ніва" нецікавая. Дык я такому гавару:

— Адкуль ты ведаеш, што яна нецікавая, калі ты яе дваццаць гадоў у руках не трымаў?

І такі „знаўца" моўчкі адыходзіць не ведаючы што адказаць, бо хлусня і абман маюць кароткія ногі. Аднак „Ніву" з календаром я ўсім, хто яе прасіў, прыношу. Праўду сказаўшы, такая трансакцыя не прыносіць мне радасці і задавальнення, а хутчэй смутак, бо тут відаць як на далоні, якімі ў сапраўднасці ёсць нашы „патрыятызм і геройства". Яны горшыя ад хваробы, бо хваробу можна вылечыць, а духовай мізэрнасці ніхто і ніколі не выправіць.

Калісь, калі „Ніва" была амаль дарэмная, я дабіваўся рэкордаў у падпісцы, бо меў па 200-300 падпісчыкаў. Але гэта не абазначае, што нашы людзі так яе масава чыталі — ім была патрэбная папера. Але ёсць на маёй тэрыторыі і жменька ніўскіх патрыётаў, якімі можна заўсёды ганарыцца.

**Мікалай Панфілюк**
17.01.1999

## Віншую „Ніву”!

Ну і адсвяткавала „Ніва” 45-годдзе! Ціхенька, спакойна, як належыць беларусам — без мерапрыемстваў.

Якой запамяталася мне „Ніва”? Помню яе з 6 года жыцця, калі бацька, вяртаючыся з горада і купіўшы патрэбныя для гаспадаркі рэчы, не забываў набыць „Ніву”, якая пастаянна гасцявала ў нашай хаце. У школу я яшчэ не хадзіў, чытаць не ўмеў, але выразаў цікавыя здымкі і абклейваў імі печку. Першае слова, якое я напісаў, было „Ніва”.

У пачатковай школе „Ніву” выпісвалі мы пастаянна. Дбалі пра гэта дырэктар Вольга Стальмасяк і Марыя Саевіч — мая першая настаўніца роднай мовы. Помню, як першы раз супольна з настаўніцай пісалі мы пісьмо ў „Зорку”. А колькі было ўцехі, калі мы знялі клуню дзядзькі Сцёпы Данілюка і выдрукавалі наш допіс. „Ніве” я ўдзячны за тое, што дэбютаваў на яе старонках.

Іншая справа была ў ліцэі. Тут „Ніва” лічылася нечым святым, якое клалася на парце, прыкрытай абрусам з беларускім арнаментам — побач са штомесячнікам „Czasopis”.

А цяпер я таксама „Ніву” чытаю пастаянна — разам з бацькамі і сябрамі. Але ж яна змянілася! Мо абражу цяперашняга рэдактара, але цяпер у „Ніве” замнога палітыкі, замала вёскі, хаця (прабачце!), ёсць куток пра бежанства і вёску. Ёсць таксама адгалоскі чытачоў, чаго няма ў іншым часопісе. А і бывае, што сварацца -ічы з -укамі ці -юкамі, што таксама выклікае цікавасць.

„Ніва” для мяне як бабулін аржаны хлеб: чым больш яго ем, тым больш хочацца есці. Прывык я да яе як да роднага панадворка, вёскі, Беласточчыны.

**Юрка Буйнюк**
8.04.2001

## „Ніве” — з удзячнасцю і нізкім паклонам

„Зусім верагодна, што ў новым стагоддзі беларускае нацыянальнае Адраджэнне пачнецца з польскай Беласточчыны”. Гэтыя прарочыя словы доктара філасофскіх навук Уладзіміра Конана ўспамінаюцца заўсёды, калі трымаю ў руках і па некалькі разоў перачытваю чарговы нумар любімай газеты.

Найбольш уражвае „Зорка” — старонка для дзяцей. Менавіта

з яе пачынаюць свой шлях у літаратуру будучыя творцы. Менавіта яна выхоўвае ў дзецях любоў да роднага слова. Менавіта яна — тая крынічка, якая не дае перасохнуць ручаіне, што ўліваецца ў вялікую раку, імя якой — беларуская літаратура.

З пашанай, пяшчотай і любоўю ставіцца газета да маленькіх аўтараў, заахвочвае іх цудоўна выкананымі фотаздымкамі, узнагародамі за правільныя адказы на крыжаванкі, знаёміць з гісторыяй, трымае ў курсе цікавых падзей, што адбываюцца ў школах, гімназіях, ліцэях.

Пільна сочыць газета за конкурсамі на лепшага дэкламатара, якія рэгулярна адбываюцца ў навучальных установах Беласточчыны, прывіваючы тым самым не толькі любоў і павагу да роднага слова, але і мастацкі густ, даючы ўдзельнікам шырокую магчымасць паглыбіць веды па літаратуры і паказаць свае акторскія здольнасці.

З вялікай павагай да асобы друкуюцца матэрыялы аб таленавітых людзях, што нарадзіліся на Беластоцкай зямлі (і тых, хто жыве, і тых, хто адышоў у вечнасць).

Вельмі прыемна, што матэрыялы, надрукаваныя ў „Ніве" знаходзяць час ад часу працяг. Маю на ўвазе не толькі творы знакамітых пісьменнікаў і паэтаў, але і тое, што „нараджаецца" ў асяроддзі людзей, на першы погляд, далёкіх ад літаратуры. Калектыўны зборнік „Сваякі" — яскравы таму прыклад.

Асобна хочацца адзначыць кнігу „Бежанства 1915 года", якая таксама ўбачыла свет дзякуючы газеце і рэдактару Віталю Лубу. У Беларусі нікому дагэтуль не прыйшло ў галаву напісаць нешта падобнае або заахвоціць да ўспамінаў жывых яшчэ дзе-нідзе ўдзельнікаў даўняй трагедыі.

Зразумела, што гэта патрэбна не столькі нам, людзям старэйшага ўзросту, колькі нашчадкам. Бо гэта — наша гісторыя. Гістарычная праўда.

Кніга нагадвае мне твор А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка „Я з вогненнай вёскі", дзе таксама гучаць жывыя галасы тых, хто прайшоў праз пекла падзей 1941-1944 гадоў.

Чытаючы „Ніву" і кнігі беларусаў Беласточчыны, цвёрда вырашыла сабе: неабходна пазнаёміць мясцовых журналістаў з калектывам, што працуе побач. Падрыхтавала вялікі матэрыял для публікацыі на старонках „Навін Камянеччыны" аб пісьменніках

і паэтах „Белавежы”. Вялікую дапамогу ў гэтым аказала мне кніга „Беларускія пісьменнікі Польшчы”, што нядаўна выйшла ў Мінску, і яе ўкладальнік Ян Чыквін.

Сорамна, але нават выкладчыкі Брэсцкага універсітэта не ведаюць усіх імёнаў, якімі ганарыцца не толькі Беласточчына — уся Польшча.

Ну а нам, бліжэйшым суседзям, сорамна ўдвая.

**Тамара Лаўрэнчук**
г. Высокае
3.06.2001

## Каб „Ніва” цікавейшай стала

У 28 н-ры „Нівы” Уладзімір Сідарук наракае, што наш тыднёвік нецікавы. Што нейкія рубрыкі трэба выкінуць, каб „Ніва” цікавейшай стала.

Сам я — настаўнік заходняй мовы, а сваёй не забываю дзякуючы „Ніве”. Думаю, што яна так цікавая, што і жыхар вёскі, і інтэлігент, студэнт, школьнік ды працаўнік — кожны хто любіць беларускасць, можа знайсці тут артыкулы для сябе. Я вельмі люблю культурныя парады Паўліны Шафран ды рэпартажы Аляксея Мароза і фельетоны Мікалая Панфілюка, які не піша ўжо шмат месяцаў. Некаторыя артыкулы мне не падабаюцца, але гэта не мая справа, каб іх выкідаць.

І яшэ адно — Уладзімір Сідарук („Ніва” н-р 22, „Тры пакаленні”) піша, што ў вёсцы Вітава зараз асфальтнае палатно. Нядаўна я праязджаў там па брукаванай вуліцы, ды і жыхары сяла гавораць, што ў „Ніве” няпраўду напісалі.

**Сцяпан Мруг**
28.07.2002

## „Ніва” заўсёды добрая

Некаторыя нашы чытачы пішуць (не буду называць прозвішчаў), што калісьці „Ніва” была лепшая, прыгажэйшая. Некаторым чытачам „Ніва” цяпер з’яўляецца цікавейшай і хваляць яе. На маю думку, „Ніва” калісьці была добрай газетай, а цяпер сталася яшчэ лепшай. З таго часу, як я пачаў пісаць у „Ніву”, мінула больш за 40 гадоў. Тады карэспандэнты пісалі кароценькія допі-

сы і вельмі цешыліся, калі яны былі надрукаваны.

Прыходзілі ў „Ніву” журналісты і адыходзілі. Адны мянялі працу на іншую, другія — перапрацаваўшы ўсё жыццё ў „Ніве”, адышлі на пенсію. Адны парвалі сувязь з „Нівай”, іншыя час ад часу паяўляюцца на яе старонках і, думаю, ніколі не парвуць сувязі з газетай. Таксама карэспандэнты — прыходзяць і адыходзяць, а „Ніва” надалей існуе і заўсёды ў кожную пятніцу паяўляецца ў хатах тых, каму дарагое роднае беларускае слова.

Была калісьці ў „Ніве” Палоска Дзядзькі Кваса. Адышоў у вечны спачын Міхась Красоўскі, прапала і Квасава палоска. Была таксама рубрыка З маёй званіцы. Цяпер няма, хаця яе аўтар сярод жывых і час ад часу друкуецца на старонках „Нівы”. Шмат гадоў быў Парнасік. Цяпер — няма, а хацелася б, каб быў ён надалей. Там жа паяўляліся і мае вершыкі. І гэта ўсё аднаму чытачу падабецца, іншаму не, і мы не маем на гэта ўплыву. Па-мойму, „Ніва” была і ёсць цікавай і прыгожай усім, каму дарагое роднае слова. Хто ёю даражыць, заўсёды падпішацца на яе на пошце або купіць у кіёску.

**Мікалай Лук’янюк**
18.08.2002

## У ніўскай сям’і ад 40 гадоў

Маё супрацоўніцтва з „Нівай” працягваецца больш за сорак гадоў. За два гады тыднёвік будзе адзначаць пяцідзесяцігоддзе. Можна сказаць, што гэта і мой юбілей. Дзякуючы „Ніве” навучыўся я роднай мове (у школе не вывучаў). Зараз карыстаюся ёю ды не саромеюся. Лічу сябе беларусам і цвёрда буду стаяць пры гэтым. Так ці інакш ніўскую сям’ю трэба адбудаваць. А ёсць магчымасць. Прыклад з тыражом. Навагодні нумар разыходзіцца вокамгненна. У Чаромсе, напрыклад, у кіёск на пероне паступае адно адзін экземпляр, а з календаром прадаўшчыца заказвае дзве-тры сотні. Таксама справа маецца ў іншых пунктах ды мясцовасцях. Праўда, своеасаблівасцю тут беларускі каляндар з царкоўнымі святамі. Але ці толькі? „«Ніва» задарагая”, — гаварыла знаёмая. „Замнога палітыкі”, — канстатавалі іншыя. У сапраўднасці, такія асобы не цікавіліся газетай і не чыталі яе ўвогуле. З майго пункту гледжання, чытачоў трэба шукаць (у асноўным) у беларускіх ася-

роддзях Гайнаўшчыны, Бельшчыны ды ў Беластоцкім і Сямятыцкім паветах, хоць не толькі. Журналістам, як і карэспандэнтам, трэба заглядаць у самыя адлеглыя куточкі, дзе пражываюць беларусы. Успамінаюцца мне шасцідзесятыя гады, калі ніўская сям'я лічыла некалькі дзесяткаў супрацоўнікаў. Пісалі земляробы, настаўнікі, працаўнікі дзяржаўных устаноў ды школьнікі. Як тады чыталі „Ніву"? Пэўна, скажаце, даражэнькія, што многае перамянілася. Праўда гэта. А колькі зараз лічыць кола супрацоўнікаў? На пальцах дзвюх рук можна пералічыць. Таму далучаюся да закліку Міколы Лук'янюка: пішыце сябры ў „Ніву", старыкі-ветэраны і вы, маладое пакаленне. З таго, што мне вядома, неўзабаве сустрэнемся на з'ездзе карэспандэнтаў. Лічу, што спаткаемся з даўнімі знаёмымі: В. Петручуком, П. Байко, М. Панфілюком, Г. Марозам, М. Куптэлем, ды многімі іншымі. Да хуткай сустрэчы.

**Уладзімір Сідарук**
1.02.2004

## Карэспандэнты

Я з'яўляюся шматгадовым карэспандэнтам „Нівы", але хачу адзначыць, што найлепшымі, па-мойму, карэспандэнтамі з'яўляюцца шматгадовы супрацоўнік Уладзімір Сідарук з Кузавы і намнога малодшы Міхал Мінцэвіч з Орлі. Абодвух іх можна палічыць прафесійнымі супрацоўнікамі тыднёвіка. Яны бачаць дабро і зло, долю і нядолю, якімі дзеляцца з чытачамі на старонках „Нівы". Я вельмі люблю чытаць допісы Мікалая Панфілюка, Мікалая Варанецкага, Дзядзькі Захара, Міхала Куптэля, Янкі Целушэцкага і іншых. Многіх карэспандэнтаў я ведаю вельмі добра, з некаторымі часта сустракаюся, але некаторых увогуле не ведаю, а хацеў бы пабачыцца хаця б адзін раз.

„Ніва" будзе адзначаць залаты юбілей свайго існавання, павінна склікаць з'езд сваіх карэспандэнтаў, каб пазнаёміліся з сабою.

**Мікалай Лук'янюк**
12.06.2005

## Сяброўства без граніц

З роднай „Нівай" знаёмы я ўжо сорак пяць гадоў, а здаецца, што нядаўна гэта пачалося, калі пасылаў свае першыя допісы. За

той немалы час пазнаёміўся са шматлікімі сябрамі, да якіх у першую чаргу варта залічыць некаторых журналістаў, якія сталі апорай маёй карэспандэнцкай дзейнасці і любві да роднага слова. Гэта, у першую чаргу, выдатны журналіст Міхась Хмялеўскі. Пісаў ён плённа і прыгожа, маючы, як гаворыцца, беларускую душу і добрае сэрца для ўсіх. Умеў ён падбадзёрваць людзей, ставіць на ногі. Ён першы прывёз мне дадому рэчавую ўзнагароду за мой уклад у развіццё роднай газеты: за паспяховыя падпіскі „Нівы", якіх я дасягаў сярод насельніцтва майго пачтовага ўчастка ды за мае карэспандэнцкія допісы. Хаця Міхась Хмялеўскі ўжо на заслужанай пенсіі, але ён надалей дапамагае людзям перакладамі. І цешыцца сэрца, што ён час ад часу піша ў „Ніву" свае цікавыя артыкулы. Не забуду і першага галоўнага рэдактара „Нівы" Георгія Валкавыцкага і ягонай жонкі Веры, што паходзіла з недалёкай Орлі. Гэта вельмі добрыя людзі і ад іх я таксама нямала навучыўся. І Сакрат Яновіч таксама некалькі разоў мяне наведаў; хадзілі мы былі разам па маёй хваіне і гутарылі пра розныя праблемы, якіх не бракавала ў нашым беларускім жыцці. З карэспандэнтаў я ў свой час дружыў і перапісваўся з Пятром Іванюком з Рыбалаў. Ён тады плённа пісаў у „Ніву", але пасля, на жаль, перастаў; мабыць выехаў недзе ў Польшчу — цікава, які яго далейшы лёс. Не ў сілах сёння ўсіх прыгадаць, бо ж я — чалавек недасканалы. Усім жадаю ўсяго найлепшага, што ёсць у гэтым свеце.

**Мікалай Панфілюк**
13.06.2004

* * *

У 24-м н-ры „Нівы" Мікалай Лук'янюк падзяліў ніўскіх карэспандэнтаў на дзве катэгорыі: на найлепшых і менш лепшых. Што ж, гэта праўда, бо язык у адных ходзіць як на пружыне, гаворка ідзе гладка як у адваката і такое аратарства пераважна аснована на хлусні. А ў іншага язык так гладка не ходзіць, яго мова нясkладная, але ў ягонай гутарцы больш рацыі і праўды. І каторы з іх больш вартасны і лепшы?

Помню, як калісьці на нейкім з'ездзе карэспандэнтаў „Нівы" яе галоўны рэдактар Георгій Валкавыцкі павучаў нас, каб мы заўсёды пісалі праўдзіва, талкова і ад сэрца, а калі ў допісе бу-

дуць дапушчаны граматычныя памылкі, тады журналісты „Нівы” іх выправяць. І так напэўна ёсць, бо гэта бачу па сваіх допісах. А дзяліць нашу жменьку на лепшых і горшых? Добра, што і такія не звяліся. А колькі ж карэспандэнтаў адышло — ці то ад пісання, ці ў вечнасць; такое жыццё.

**Мікалай Панфілюк**
10.07.2005

### На хвалях часу

У апошнюю суботу ліпеня мае Рыбакі апусташэлі, бо амаль усе жыхары паехалі на машынах у Гарадок на „Сяброўскую бяседу”. Паехаў і я. У Гарадку ўразілі мяне чысціня і парадак, разнакаляровыя кветкі ў агародчыках. Затым падаемся ва ўрочышча Борык, дзе адбудзецца мерапрыемства. Парадкавыя службы інфармуюць як далей ехаць і дзе паставіць машыну. Працуюць ужо ларкі з усялякай усячынай.

А семнаццатай гадзіне войт Гарадоцкай гміны і старшыня ГП БГКТ адкрылі мерапрыемства, на якім выступіла каля пяцідзесяці калектываў з Польшчы, Беларусі і Украіны. Суарганізатар — Гарадоцкі асяродак культуры — дзейнічае ў карысць беларускага і польскага грамадства. „Сяброўская бяседа” ў падгарадоцкім Борыку асвятляе жыццё вялікага славянскага супольніцтва, адкрывае скарбонку славянскай культуры.

На свята былі запрошаны сродкі масавай інфармацыі. Журналістаў Польскага радыё Беласток, „Газеты вспулчэснай” прывітаў войт. На вялікі жаль ніхто нават словам не ўспомніў аб прысутнасці на свяце тыднёвіка беларусаў у Польшчы „Ніва”, карэспандэнтам якой я з’яўляюся ад пачатку яе існавання. Калісьці „Ніва” супрацоўнічала з БГКТ. Сёння гэтыя дзве ўстановы адвярнуліся ад сябе.

На маю думку, калі з абодвух бакоў не будзе добрай волі, каб адмяніць сітуацыю, то нічога само па сабе не зменіцца. Шаноўныя дзеячы, адгукніцеся адзін да аднаго і абмяркуйце закранутае мною пытанне. Усіх нас яднае адзін найважнейшы фактар — наша родная мова.

**Віктар Бура**
4.09.2005

# НЕ ТАКІ ЕЎРАСАЮЗ СТРАШНЫ

## Ці чакаць нам манны нябеснай?

Вельмі шкада, што агульнапольская, аб'ектыўная і фармуючая грамадскую думку прэса недаступная некаторым ніўскім карэспандэнтам і чытачам „Нівы". Не пішу пра журналістаў, бо іх абавязак чытаць, прынамсі, усё, што тычыцца беларусаў і Беларусі. Цэзары Галіньскі, мінскі карэспандэнт „Газеты Выбарчай" піша (Г.В., 8.06.2001 г.): „Podobnie (так як арганізатара альтэрнатыўных прэзідэнцкіх выбараў у 1999 годзе Віктара Ганчара і былога прэм'ера Міхаіла Чыгіра) potraktowano potencjalnych przeciwników Łukaszenki w tegorocznych wyborach prezydenckich. Potencjalnych, bo przed ogłoszeniem daty wyborów, nie mogli zgłosić kandydatów. Na początku roku aresztowano młodszego syna byłego premiera Czyhira – jest podejrzany o handel kradzionymi samochodami. Syna zbiegłej do Wlk. Brytanii byłej szefowej Banku Narodowego Tamary Winnikowej, która wiele wie o mechanizmach władzy na Białorusi aresztowano za posiadanie narkotyków". Калі б Мікалай Панфілюк, прачытаў карэспандэнцыю Цэзара Галіньскага, то можа хоць крышку падумаў бы рэфлексіўна, што можа з „дэмакратыяй" Лукашэнкі не так, як хваліць яе дэпутат польскага Сейма Ян Сычэўскі, выбраны не беларусамі Беласточчыны, а толькі дзякуючы краёваму спіску СЛД.

Уважліва прачытаў я інфармацыю Міхася Хмялеўскага з пашыранага пленарнага пасяджэння Галоўнага праўлення БГКТ, якое адбылося 29 красавіка г.г. Апрача тэмы, невядома яшчэ ці актуальнай, „БГКТ у парламенцкіх выбарах 2001 г." тэмай пасяджэння пленума была „Справаздачна-выбарная кампанія і падрыхтоўка да XIV З'езда БГКТ". Пад якім, прынамсі мяне цікавіць, лозунгам адбудзецца кампанія? Што хоча дасягнуць БГКТ? Якія справы наладзіць у грамадскасці беларусаў Беласточчыны? Бо ў мяне складаецца ўражанне, што апрача ладжання фэстаў, БГКТ нічым station станоўчым не займаецца.

А ёсць дзялянка дзейнасці для няўрадавых беларускіх арганізацый Беласточчыны, і то больш станоўчая, чым арганізацыя такіх мерапрыемстваў як Купалле ці шматлікія фестывалі і фэсты. Гэта перш за ўсё вядзенне пастаяннай асветніцкай працы сярод сялян на тэму гаспадарчай дзейнасці ў змененых капіталістычных умовах і рынначнай гас-

падарцы. Нельга думаць, што вернецца эпоха падобная на лукашэнкаўскую. Трэба, спадары лідэры беларускіх арганізацый, войты і начальнікі, ісці ў народ і вучыць яго як карыстацца грошамі еўрапейскіх фондаў, як карыстацца Інтэрнэтам, каб пахваліцца сваёй прадукцыяй і каб інфармацыя аб ёй хадзіла да пакупнікоў. Каб атрымаць грант на канкрэтную дзейнасць, трэба ведаць як напісаць пераканаўчы праект выкарыстання фінансавых сродкаў. Тут не можа быць агульнага падыходу да тэмы, а дэталёвы, бо інакш ніхто і гаварыць не схоча. Думаю, што абавязкам усіх радных, войтаў і бурмістраў з'яўляецца дапамога людзям перамагаць дрэннае становішча. За тое яны бяруць грошы, а не за тое, каб грэць крэслы. Не ведаю чаму, якія рацыянальныя аргументы падпавядаюць нашым дзеячам адкідаць еўрапейскі напрамак палітыкі III Рэчы Паспалітай. Калі Дарафей Фіёнік не бачыць карысці для нашай меншасці ад такой палітыкі, то фактычна не трэба дзівавацца Яну Сычэўскаму, які расхвальвае лукашэнкаўскую сістэму ў Беларусі. Д. Фіёнік піша, што „«тройка» не ідзе за моднай цяпер індактрынацыяй дзяцей у еўрасаюзным напрамку і не арганізуе абсурдных «еўрапейскіх» святкаванняў. Усё гэта праўда, і ўсё гэта вельмі добра. І той школай трэба нам даражыць". Даражыць трэба, спадар Фіёнік, усім, чым „школа цэніць і развівае ўсё што роднае, найбліжэйшае сэрцу", але гэта не пярэчыць еўрапейскаму напрамку развіцця грамадскасці. У скансэн беларусаў зачыніць трэба, ці як. З таго, аб чым піша Фіёнік вынікае, што еўрапейскі напрамак шкодны беларусам. Разумею, што Еўропа шкодзіць лукашэнкаўскаму рэжыму, але нам, тут?! Думаю, што трэба карыстацца ўсім, што добрае ў Еўропе. Прынамсі не будзем рабіць памылак, якія рабіла Еўропа на шляху свайго развіцця. Не ведаю, чаму з такой зацятасцю і нянавісцю нашы людзі пагардліва гавораць пра „дэмакратыю". Што ім гэта „дэмакратыя" забрала? Шчасце? Грошы? І пры чым тут дэмакратыя? Вядома, прывыклі мы, што хтосьці за нас думаў, „даваў" кватэру, машыну, трактар. Дайшло да таго, што давалі ўжо харчовыя прадукты на талоны. А вытворчасць тады ішла поўным ходам. Даваў! Як жабраку. А атрымліваў гэтае дабро той, хто быў бліжэй карыта. Пра якую тут можна гаварыць справядлівасць, калі без хабараў нічога не можна было купіць, ані аформіць. Мільёны людзей карысталіся працай іншых, перад усім працай сялян. Вёска трымала на сваіх плячах амаль цэлы прагрэс горада. І таму зараз вёска адстае ад узроўню еўра-

пейскага вясковага жыцця. Але ці толькі такая прычына заняпаду жыцця? Перад усім кошт трансфармацыі з так званай размеркавальнай гаспадаркі да рыначнай адчувае агул малаадукаваных людзей, прынамсі ў яе пачатковай фазе. Цяпер цяжка знайсці працу нават і высокаадукаваным маладым людзям. Але ці гэта абазначае, што трэба чакаць манны нябеснай, або таго аднаго справядлівага бацьку, які зробіць усіх шчаслівымі?

**Міхась Куптэль**
12.08.2001

## Еўрарэгіён „Белавежская пушча"

18 студзеня г.г. у Пружанах праходзіла сустрэча наконт стварэння трансгранічнага рэгіёна Белавежскай пушчы, у якой удзельнічалі прадстаўнікі Пружанскага і Камянецкага раёнаў, ды Гайнаўскага павета. Польскую дэлегацыю ўзначаліў стараста Уладзімір Пятрочук. Дэлегацыю з сямі чалавек састаўлялі, між іншым, бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк і войт Белавежскай гміны Станіслаў Куявяк. Варта адзначыць, што Белавежа ад даўжэйшага часу супрацоўнічае з Пружанскім раёнам. Пажаданнем абодвух бакоў было пашырэнне кантактаў і ўсебаковае супрацоўніцтва ў рамках еўрарэгіёна „Белавежская пушча".

У час сустрэчы ўдзельнікі абмяркоўвалі пытанні аховы асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання натуральнай сыравіны, трансгранічнага абмену ў грамадска-гаспадарчай галіне, у культурнаасветнай дзейнасці і турызме.

Еўрарэгіён „Белавежская пушча" займаў бы тэрыторыю Гайнаўскага павета і трох раёнаў на беларускім баку: Пружанскага, Свіслацкага і Камянецкага. Пасля дыскусіі падпісаны быў дагавор аб намерах рэгіянальнага супрацоўніцтва ў еўрарэгіёне „Белавежская пушча". На апошнім этапе падрыхтовачнай працы будуць абмяркоўвацца прапановы паасобных устаноў да статута.

Цяпер у краіне існуе пятнаццаць еўрарэгіёнаў. Ва ўсходняй частцы працуюць два найбольшыя: „Буг" і „Нёман", „Белавежская пушча" будзе трэцім еўрарэгіёнам на ўсходнім пагранііччы.

Еўрарэгіёны прыцягваюць фінансавыя сродкі з еўрасаюзных структур.

**Уладзімір Сідарук**
10.02.2002

## Людзі баяцца Еўрасаюза

Неўзабаве май 2004 года — уваход Польшчы ў Еўрасаюз. Некаторыя грамадзяне нашай краіны вельмі гэтаму рады, некаторыя — баяцца ЕС, асабліва пенсіянеры, чорнарабочыя ды сяляне.

Міністр Гаўзнер павышаючы пенсіі ў сакавіку заявіў, што павышэнне абавязвае на два гады. У пераважнай большасці былі гэта невялікія грошы і, агульна кажучы, павышэнне пенсій аказалася быць малазаўважальным у партфелях пенсіянераў, бо ў той жа час павышаны былі цэны многіх харчовых прадуктаў і паслуг. Пенсіянерам не палепшылася жыццё, а пагоршала.

Неўзабаве, калі адбудзецца зраўнанне айчынных цэн на прадукты і тавары з еўрасаюзнымі, то пенсіянерам, беспрацоўным і звычайным чорнарабочым — хоць ты жывым лезь у зямлю. Пагінуць малыя падляшскія гаспадаркі, а вяскоўцы астануцца парабкамі без працы і хлеба. Перастануць ездзіць па вёсках аб'язныя крамы, бо не вытрымаюць еўрасаюзных санітарных нормаў, а новых крамаў не будзе каму будаваць. Старыя пенсіянеры не змогуць даехаць у горад за пакупкамі неабходных тавараў, бо прадпрыемства ПКС адменіць нерэнтабельныя аўтобусныя маршруты. Прыйдзе час, калі людзі стануць праклінаць чыноўнікаў, што давялі краіну да такога заняпаду. Што было дзяржаўнае, лепшае чыноўнікі распрадалі за бясцэнак сваім ашуканцам або бізнесменам-чужынцам, якія цяпер увальняюць рабочых з працы, развальваюць прадпрыемствы, а свае тавары прывозяць з-за мяжы і дыктуюць уладам свае цэны, а ты нічога не скажаш. Найгорш баюся таго, што калі адбудзецца „пяты падзел" Польшчы, то яна ўжо больш не адродзіцца, загіне навекі. Гэта будзе вельмі страшны час.

**Мікалай Лук'янюк**
11.04.2004

## КРАЯЗНАЎЧЫ СЛОЎНІК

# АБ БЕЛАРУСІ І ЯЕ ПРЭЗІДЭНЦЕ

### Паважаны рэдакцыйны калектыў тыднёвіка „Ніва"

Звяртаюся з вялікай просьбаю надрукаваць на старонках нашага пачэснага тыднёвіка словы абурэння і пратэсту супраць ілжывым выказванням дыпламатаў рэжыму Аляксандра Лукашэнкі па справе праведзенага пікета 1 траўня 1996 г. у Беластоку. На самай справе пікет пратэсту праведзены быў у мірных абставінах ля будынка Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку. Сцвярджаю, бо асабіста ўдзельнічаў я ў гэтым пікеце, што быў ён праведзены, каб выказаць рашучы пратэст супроць парушэнняў правоў чалавека ды жорсткага разгону мірнай дэманстрацыі жыхароў Менска ў 10 угодкі чарнобыльскай трагедыі. Удзельнікі пікета хацелі сустрэцца з генеральным консулам, каб з ягоных вуснаў даведацца, што сапраўды здарылася ў Менску 26 красавіка 1996 г. Некалькі хвілін удзельнікі пікета чакалі спадара Слямнёва. Аднак калі консул не выйшаў на спатканне, удзельнікі пікета ў знак пратэсту спалілі партрэт чалавека, які сваімі дзеяннямі парушае канстытуцыйныя законы дзяржавы і які паставіў сабе за мэту ліквідаваць незалежны дзяржаўны быт Беларусі, ды аддаць нашу Бацькаўшчыну ў каланіяльную расейскую няволю.

Прадстаўнік рэжыму назваў спалены партрэт Лукашэнкі дзяржаўным сімвалам Рэспублікі Беларусь. Такое выказванне, на маю думку, можа рабіць толькі чалавек, які не разумее, што такое дзяржаўныя сімвалы. Удзельнікі пікета з вялікаю пашанаю і годнасцю трымалі ў руках дзяржаўны сімвал Беларусі — бел-чырвона-белы сцяг, а лукашэнкаўскага — чырвона-зялёнага — увогуле на будынку консульства не было. Якое ж жахлівае здзіўленне навяло выказванне другога прадстаўніка рэжыму, пасла Бурскага з Варшавы (па Беластокім радыё) наконт падзеяў 26 красавіка ў Менску. Спадар Бурскі гаворыць, што ў Менск прыехала каля трыццаці ўкраінскіх нацыяналістаў, якія мелі намер рабіць дзяржаўны пераварот. Шкада, што сп. Бурскі не сказаў, колькі рэжым Лукашэнкі кінуў супроць мірных дэманстрантаў батальёнаў АМОНу, міліцыі, КДБ ды жаўнераў, якія дубінкамі білі жанчын, дзяцей, школьнікаў, праводзячы арышты невінаватых грамадзян, у тым ліку дзеячаў апазіцыі. Не на ўкраінскіх нацыяналістаў рэжым Лукашэнкі выпусціў раз'юшаных амонаўцаў, але супроць сваіх гра-

мадзян. Пытаю тады: „Прадстаўнікі рэжыму, чаму хлусіце!" Я яшчэ раз рашуча пратэстую супроць негуманітарных паводзін сілавых органаў рэжыму Лукашэнкі, накіраваных супроць удзельнікаў мірнай дэманстрацыі 26 красавіка 1996 г. у Менску і патрабую вызваліць арыштаваных дзеячаў Беларускага народнага фронту.

**Юстын Пракаповіч**
26.05.1996

**Шаноўныя рэдактары „Нівы".**

Я, пастаянны чытач вашага тыднёвіка, хачу падзяліцца сваімі заўвагамі наконт таго, што пішаце пра прэзідэнта Беларусі. Ён — чалавек вельмі адукаваны і я не разумею, чаму называеце яго калгаснікам, ды параўноўваеце да таго славутага Эмігранта з Грузіі, які быў прысланы, каб знішчыць праваслаўную рэлігію. Лукашэнка нікому не забараняе маліцца і будаваць касцёлы. Хвала яму за гэта, што ніякім Зэнкам, Мечыславам, Станіславам не дазволіў разжыцца коштам беларусаў. Слава Яму!

Добра, што не паверыў Захаду і не разваліў калгасаў. Адразу быў бы голад і смерць беларусам, а апрача Расіі ніхто нам не дапаможа. Беларусь звязана з Расіяй назаўсёды. Лукашэнка не забараняе вучыцца беларускай мове. Гэта справа іх, беларусаў, маюць жа вольны выбар. Мы таксама не гаворым на вуліцы на беларускай мове.

Ваш Янэк закрануў пра рэжым Ярузельскага. „Ніва" не павінна такіх дурнотаў друкаваць. Каб Войтэк тады не зрабіў парадку, мы ўжо напэўна не маглі б „Нівы" чытаць. Нейкі Адась (ідзе пра Міхніка — рэд.) называе Прэзідэнта шэфам калгаса і раўняе яго да Вольфавіча Уладзіміра. А хто выдумаў калгасы і „чэка", разбіваў купалы цэркваў? Забылі ўжо пра свайго Фэлікса?

Зэнкі, Станіславы, Мечыславы хацелі б зрабіць у Беларусі так, як у Сербіі. Тады цешыліся б. Гэты Вука, што выступае супраць Мілашэвіча — гэта хрыстапрадавец, робіць усё за чужыя грошы. Дайшло да таго, што чорны амерыканец павучае сербаў і пагражае жалезнымі дзідамі, калі не будуць яго слухаць.

Прабачце, што так дрэнна пішу на беларускай мове. Гэта вынік палітыкі пана Масьціцкага і Рыдза-Сміглага.

**Алесь В.**
Беласток
19.01.1997

## Чарговы раз пра А. Лукашэнку

Я — чалавек неадукаваны. Беларускай мове два гады мяне ўсяго вучылі. У маленстве цяжка давялося мне хварэць і самыя бурлівыя гады праляцелі побач мяне. Частае прабыванне ў бальніцах і даволі частыя аперацыі не дазволілі здабыць нейкую прафесію ці закончыць сярэдняе вучылішча. Лёс не паскупіў рознага роду прыкрасцяў. Аднак на яго няма поваду абурацца ці крыўдзіцца. Ён мне дазволіў карыстацца самым каштоўным у жыцці кожнага чалавека — разбірацца лагічна ў рознага роду абставінах. Уласна кажучы, што такое дэмакратыя? Хто яе прыхільнік, а хто вораг?

Актуальна ніўскія журналісты праліваюць кракадзілавыя слёзы над Рэспублікай Беларусь. Прышываюць усё новыя і новыя чорныя латкі прэзідэнту Лукашэнку.

Ці гэта згодна з правамі дэмакратыі?

Па-мойму — не. Не імкнуся бараніць прэзідэнта Беларусі. Я толькі бараню дэмакратыю. Бо калі большасць выбаршчыкаў Рэспублікі Беларусь дэмакратычным спосабам, у ходзе такога ж самога галасавання выбіраюць на пасаду прэзідэнта менавіта А. Лукашэнку, то ягоныя непрыхільнікі (апазіцыя) павінны падпарадкавацца большасці і дазволіць яму спакойна, без ніякіх там дэманстрацый давесці да канца кадэнцыю, а затым выбраць свайго кандыдата прэзідэнтам, калі апазіцыя ў змозе будзе прыцягнуць адпаведную колькасць электарату. На жаль, апазіцыя такога электарату не мае і сілаю намагаецца вырваць прэзідэнцкае крэсла з-пад А. Лукашэнкі. Вельмі часта ўключаю I праграму Мінскага радыё, цікаўлюся падзеямі на Беларусі, між іншым слухаю „Сельскую раніцу" і толькі таму жыве яшчэ Беларусь, бо жывуць у ёй яшчэ калгасы і саўгасы, у іншым выпадку Беларусь пастаўлена была б на калені. Аб гэтым павінен ведаць спадар Я. Максімюк. Слухаў я таксама трансляцыю з усенароднага сходу перад рэферэндумам і ўпэўнена скажу аб гэтым, што дэмакратыя на Беларусі ёсць захаваная. Паколькі дамінуючую колькасць апазіцыі састаўляюць Зэнкі, Стаські, Мечыславы і ім падобныя, то зразумела, што гэта абазначае і што чакае Рэспубліку Беларусь.

Ці занікне беларуская мова ў выніку інтэграцыі з Расіяй? На

гэта не маюць ніякага ўплыву ні А. Латышонак, ні М. Ваўранюк, ні Я. Максімюк і ім падобныя ягамосці. Аб гэтым вырашыць беларускі народ. Мне здаецца, што беларуская мова не прападзе ў карысць рускай, таму што яна надта прыгожая і не кахаць яе нельга.

**Валянцін Семянюк**
9.02.1997

**Шаноўны спадар галоўны рэдактар!**

Чытаючы ўсе Вашы артыкулы ў „Ніве", я дайшоў да вываду, што галоўнаму рэдактару беларускага тыднёвіка трэба захаваць нейтральнасць у ацэнцы палітычнай сітуацыі ў Беларусі. Вам, на жаль, не падабаецца тое, што дзеецца ў Беларусі. Вам не падабаецца, што 80 працэнтаў беларусаў прагаласавала за Лукашэнку і выбрала яго прэзідэнтам. Калі беларускі народ адкінуў Шушкевіча і Пазьняка, выказаў такім чынам сваю волю. Ваш артыкул „Міфы і факты" („Ніва", н-р 5) паказвае, што шмат чаго не разумееце. Стары беларус раіў Вам не брудзіць свайго гнязда. Спадар Валянцін Семянюк у лісце да рэдакцыі („Ніва", н-р 6) яшчэ раз даказаў, што Лукашэнку выбралі ў дэмакратычных выбарах. Я часта бываю ў Гродне і быў там падчас рэферэндуму. Усе выбаршчыкі, з якімі я гаварыў, заяўлялі, што галасавалі так як прапанаваў Лукашэнка, а прытым адкрыта гаварылі, што калі будзе рэферэндум у справе аб'яднання Беларусі з Расеяй, таксама акажуць падтрымку прэзідэнту ў гэтай справе.

Знайце тады, што Беларусь без Расіі нікуды не дойдзе. Калісь Багдан Хмяльніцкі падпісаў дагавор з Расіяй пад лозунгам „Навеки вместе". Сёння нейкія Краўчукі ці Кучмы гэтага не хочуць. Але так ці інакш Украіна вернецца пад крылы Расіі. І прымуць іх, як сваіх.

У Беларусі цяпер цяжка жыць. Быў я на Калядах ў Гродне. У крамах усё ёсць, але людзі не маюць за што купляць, хаця на святочным стале была найлепшая каўбаса і каньякі. Урад дазваляе беларускаму народу займацца гандлем. Заводы стаяць, няма каму рабіць, а на мяжы поўна гандляроў. Каб долар каштаваў 100 тысяч рублёў замест 20 тысяч, тады людзі не ездзілі б, а працавалі б. А тое, што няма збыту на тавары, гэта віна гарбачоўскай перастройкі, якая разбурыла Савецкі Саюз. І няма чаго тут абурацца на беларускі народ, які даверыў свой лёс Лукашэнку. Беларусь і Расія будзе адно і не далівайце бензіну ў агонь, бо Бе-

ларусь не пойдзе дарогай Балгарыі, Сербіі, ці Румыніі.

Цяпер яшчэ адна справа. Вы напісалі, што Лукашэнка — гэта атэіст і няхрышчаны чалавек. Можа яно і так ёсць, але думаеце, што калі ўжо нехта хрышчаны, тады ён лепшы. У нас у Міхалове, напрыклад, у лістападзе мелі асвяціць школу. Запрасілі двух беластоцкіх епіскапаў — Саву і Шымэцкага. І што — адзін не хацеў бачыць другога. А мы думалі, што такія хрысціяне „przekażą sobie znak pokoju". Што з гэтага, калі нехта ахрышчаны і мае нават метрыку, але ў сэрцы таго хрысціянства ні трохі не відаць, і няма тае сапраўднай хрысціянскай любові. У адным з апошніх нумароў „Нівы" Алесь Барскі вельмі прыгожа піша, што чакае Беларусь. І няхай вам не баліць галава за яе лёс. Лукашэнка вядзе яе ў добрым напрамку.

**Дзядзька Захар**
2.03.1997

# АБ ВАЙНЕ Ў ЮГАСЛАВІІ І ІРАКУ

### Быццам Галіаф з Давідам

Апошнія дні сакавіка прынеслі ўскладненне сітуацыі на Балканах, у выніку чаго пачалася авіяцыйная вайна краін НАТО супраць Сербіі. І хаця сербы на амерыканцаў не нападалі, то ЗША са сваімі магутнымі паветранымі сіламі і пры дапамозе Нямеччыны, Італіі, Англіі ды Францыі стала бамбардзіраваць югаслаўскія гарады, наносячы смерць і пакуты мірнаму насельніцтву гэтай цудоўнай краіны. Афіцыйна атака тлумачыцца вайной супраць прэзідэнта Слабадана Мілошавіча, але ўсё ж такі церпяць невінаватыя грамадзяне.

У гэтым негуманным і беззаконным дзеянні (ЗША не пыталі дазволу Савета Бяспекі ААН) амерыканцам маральна дапамагаюць іншыя члены НАТО, у тым ліку і наша дзяржава. А відаць гэта па аднабокім асвятленні падзей у польскіх сродках масавай інфармацыі, у якіх пра сербаў гаворыцца выключна як аб злачынцах.

Кім жа тады з'яўляюцца падпольшчыкі з г.зв. албанскай вызваленчай арміі? Мы тут, на Беласточчыне, добра ведаем дзеянні падпольных фарміраванняў пасля заканчэння ІІ сусветнай вайны. На маю думку, усе падпольныя арганізацыі ўсюды аднолькава паводзяць сябе ў дзеянні. Амерыканцы абвінавачваюць толькі сербаў у парушэнні правоў албанскай нацыянальнай меншасці ў Косаве.

А ці ў іншых краінах не парушаюцца правы нацменаў? Хопіць прывесці прыклад Турцыі, якая не хоча выйсці насустрач курдскім патрабаванням. Турцыя змагаецца з курдамі ўжо шмат гадоў, у выніку чаго загінулі тысячы людзей. Але ЗША не чапае Турцыю, свайго хаўрусніка па НАТО. Амерыканцам спадабалася біць малыя, слабыя народы. Да гэтай пары білі іракцаў, цяпер узяліся за сербаў. Добра памятаем вайну ў Чачні, але тады Амерыка лічыла яе ўнутранай справай Расіі. Падобных сітуацый, калі парушаюцца правы чалавека, можна прывесці больш. Напрыклад, Афганістан, Судан, Алжыр, Інданезія ці Шры-Ланка. А ў Еўропе таксама неспакойна не толькі на Балканах. У Іспаніі ўлады жорстка распраўляюцца з баскамі, а ў Вялікабрытаніі — з ірландцамі.

Чаму тады ЗША пачалі вайну супраць Югаславіі? Ці сапраўды прычынай гэтаму з'яўляецца абарона косаўскіх албанцаў? Мабыць, адказ прынясе будучыня. Пакуль што з тэлебачання можна было даведацца, што прэзідэнт ЗША Біл Клінтан абасноўваў сваё рашэнне неабходнасцю „навесці парадак у гэтай частцы Еўропы, каб амерыканскія прадпрымальнікі маглі беспярашкодна ўвозіць у Еўропу свае тавары ды прадаваць там". Усё становіцца зразумелым: ЗША абараняюць свае інтарэсы!

А мы, польскія грамадзяне, можам толькі прыглядацца да гэтага і цешыцца як Галіаф распраўляецца з Давідам ды пляскаць у ладкі. А калі Галіафу спатрэбіцца наша дапамога, тады пашлем нашых жаўнераў, каб разам з немцамі ды італьянцамі змагацца супраць сербаў. Нездарма ў тэлебачанні паказваюць як нашы дэсантнікі рыхтуюцца да садзеяння натаўскім падраздзяленням.

Для мяне, як ветэрана II сусветнай вайны, добра запомніўся гераізм югаслаўскіх партызан, у асноўным сербаў, у барацьбе з гітлераўскімі захопнікамі. Калі ў ліпені 1944 года быў абвешчаны набор добраахвотнікаў у Югаславію, я быў адным з ахвотных паехаць туды. Але сітуацыя на балканскім фронце хутка памянялася і партызаны самі здолелі вызваліць Югаславію і суседнюю Албанію.

Сёння выказваю словы салідарнасці з тымі людзьмі, якія цвяроза ацэньваюць сітуацыю ў Югаславіі і не паўтараюць лозунгі амерыканскай прапаганды. Маю тут на ўвазе Тадэуша Мазавецкага, а таксама Яўгена Чыквіна з сябрамі са штомесячніка „Przegląd Prawosławny", якія выслалі пратэст прэзідэнту Аляксандру Кваснеўскаму.

Праваслаўны ардынарыят Войска Польскага таксама павінен зрабіць усё, каб жаўнеры праваслаўнага веравызнання не былі высланы ваяваць супраць сербаў — праваслаўных славян.

**Юстын Пракаповіч**
9.05.1999

## Праўда на баку пераможцаў

У 2 н-ры „Нівы" ад 12 студзеня г.г. друкаваўся допіс Васіля Петручука «„Героі" і „бандыты"». Праўду напісаў аўтар. Зараз у нас усё навыварат пайшло. Каты мірнага беларускага насельніцтва называюцца героямі, а тыя, што аддавалі жыццё за Айчыну, яе свабоду і незалежнасць асуджаюцца.

Пасля заняпаду камуны і прыходу да ўлады постсалідарніцкіх груповак наша палітыка прыняла іншы напрамак. Зараз на ўсходзе — злачынцы, на захадзе — героі.

На Блізкім Усходзе не ціхне вайна. Ізраіль разбурае гарады і вёскі палесцінцаў. Гінуць людзі. Дзеецца гэта на вачах усяго свету. А свет маўчыць...

Калі аль-Каіда зрабіла замах на Сусветны гандлёвы цэнтр у Нью-Йорку ў верасні 2001 года, пачуўся плач на ўсю планету (спачуваю сем'ям нявінна загінуўшых амерыканцаў). Па палесцінцах ніхто не плача, бо гэта людзі трэцяга свету.

Джордж Буш публічна аб'явіў акцыю супраць Ірака. Галосіць усяму свету, што Гусейн стварае пагрозу біялагічнай вайны. Рыхтуецца да агрэсіі, шукае саюзнікаў. Пакуль што, адна Вялікабрытанія стала на баку Амерыкі. Еўропа да справы ставіцца скептычна. Супраць вайны выказваюцца Нямеччына, Францыя і Расія. Толькі міністр Цімашэвіч заявіў, што нягледзячы на тое, ці міжнародны форум дазволіць Амерыцы і саюзнікам на вайну з Іракам ці не, Польшча стане на баку Амерыкі і можа, як спатрэбіцца, паслаць войска (раней, такі пункт гледжання выказаў прэзідэнт Кваснеўскі ў час візіту ў Амерыцы). Узбударажыла гэта многіх палітыкаў, як і звычайных грамадзян. Расхвалявала гэта мяне таксама. На маю думку партнёраў і саюзнікаў трэба нам у першую чаргу шукаць у Еўропе.

**Уладзімір Сідарук**
9.02.2003

## Ці новы крыжовы паход?

Пачатак 2003 года прыносіць народам свету трывожныя весткі пра падзеі вакол малой блізкаўсходняй дзяржавы — Ірака. Амерыканскі прэзідэнт Джордж Буш набраў ахвоты ашчасліўіць амерыканскі і іншыя народы новаю ваеннаю завірухай. Ён нават гатовы не ўлічваць меркавання ААН на гэты конт і пайсці вайною супраць Ірака; калі б так сталася, можна будзе тое смела назваць агрэсіяй.

Прэзідэнт Буш намагаецца ўцягнуць у той канфлікт членаў абарончага саюза НАТА. Паяўляецца тады пытанне: дзеля якой мэты існуе гэты саюз, які ў далейшай будучыні мае пашырыцца на краіны Прыбалтыкі і іншыя?

Як памятаем, паўночнаатлантычны пакт быў заснаваны дзеля абароны заходніх дзяржаў ад пагрозы з боку Савецкага Саюза. Савецкі Саюз перастаў існаваць, а за ім перастаў дзейнічаць і Варшаўскі дагавор, у склад якога ўваходзіла і наша дзяржава. Нягледзячы на гэта НАТА далей існуе ды яшчэ пашыраецца на былыя сацыялістычныя дзяржавы. Да таго ж, як інфармавалі некаторыя польскія газеты, ЗША хадайнічаюць, каб на тэрыторыі нашай краіны пабудаваць свае ваенныя базы. Намеснік міністра абароны Януш Земке ў крывадушны спосаб тлумачыў па тэлебачанні, што амерыканцы хочуць толькі карыстацца нашымі палігонамі дзеля абучэння сваіх жаўнераў. А ці ж гэта не тое самае? Хай амерыканцы абучаюцца ў сябе — маюць там дастаткова прасторы.

Добра помнім, як амерыканскія і натаўскія самалёты безадказна бамбілі гарады і сёлы Югаславіі. Была гэта агрэсіўная вайна, у якой загінулі дзесяткі тысяч мірнага насельніцтва. За тое злачынства ніводзін агрэсар не быў прыцягнуты да адказнасці.

Цяпер прэзідэнту Бушу захацелася іракскай нафты, дык прыдумалі, што Садам Гусейн вырабляе зброю масавага знішчэння. Міжнародная камісія ад ААН на працягу трох месяцаў не знайшла тае зброі, аднак Буш не пакідае сваіх агрэсіўных планаў і рыхтуецца да новага, на маю думку, крыжовага паходу, як калісь крыжаносцы супраць іншаверных.

Прэзідэнт Буш заахвочвае сваіх натаўскіх саюзнікаў далучыцца да агрэсіўных дзеянняў супраць Ірака. Больш разважлівыя члены пакта, як Нямеччына, Францыя і Бельгія, рашуча адмаўляюцца ад ваеннай авантуры. Вайну можна вельмі хутка распачаць, толькі невя-

дома, як яе закончыць; пераканаўся аб гэтым галоўны ініцыятар другой сусветнай вайны, добра вядомы старэйшаму пакаленню Адольф.

Простаму грамадзяніну цяжка зразумець стаўленне да гэтай справы кіруючых дзяржавай асоб. Польскія патрыёты кіраваліся калісь лозунгам „За нашу і вашу свабоду". Гэта абазначае, што палякі не будуць ваяваць супраць незалежнай дзяржавы, якою з'яўляецца Ірак. У народзе існуе жартаўлівая прыказка пра стаўленне кіраўнікоў нашай дзяржавы да амерыканска-іракскага канфлікта: „Дзе каня куюць, там і жаба падстаўляе сваю нагу, каб і яе каваль падкаваў".

Дзяржава наша ўступіла ў НАТА дзеля супольнай абароны ад агрэсара. А дзе той агрэсар, мы, простыя грамадзяне, не ведаем. Гавораць, што тэрарысты здзейснілі тэракт у Нью-Йорку. Здарылася гэта ўнутры самой дзяржавы, ніводзін тэрарыст не ўчыніў гэтага тэракту звонку. Няхай амерыканцы ўнутры сваёй дзяржавы пільнуюць сваіх гарадоў і самалётаў; пры чым у гэтай справе Ірак ці іншыя краіны?

У адной з перадач беластоцкага радыёвяшчання ад канца студзеня паведамлялася, што Літва задаволіла просьбу амерыканцаў і дазволіла іх ваеннай авіяцыі карыстацца сваёй паветранай прасторай і аэрадромамі ў час вайны супраць Ірака. Дзе Літва, а дзе Ірак, і як тыя самалёты будуць весці ваенныя дзеянні? Такія падзеі прыводзяць да высновы, што наступнымі ахвярамі амерыканскай авантуры будуць несумненна краіны мяжуючыя з НАТА.

Натаўскія краіны мяняюць сваё ўзбраенне. Наша дзяржава, не зважаючы на крытычны стан эканомікі — больш за 3,5 мільёна беспрацоўных — купляе за 8 мільярдаў долараў 46 амерыканскіх самалётаў „F-16". Ці тымі самалётамі ўрад дасць утрыманне штораз бяднеючым сваім беспрацоўным грамадзянам? Беспрацоўныя патрабуюць працы і хлеба, а новыя самалёты ў нашых абставінах лічу непатрэбнымі.

Гэта мае асабістыя думкі пра падзеі, якія трывожаць грамадства.

**Юстын Пракаповіч**

23.03.2003

### Хто скарыстае на будаванні дарог у Іраку?

У цікавым артыкуле „У Іраку будуюць дарогі" ў „Ніве" № 17 Яўген Мірановіч піша: „Кожнага дня ў тэлебачанні можна пачуць як салідарнасць з іракскім народам прымушае нашых дзяржаўных дзе-

ячаў пасылаць будаўнічых у Ірак дапамагаць жыхарам гэтай краіны прыйсці да дабрабыту і дэмакратыі. Дзеля гэтага будуць арабам пракладаць дарогі, узводзіць палацы і фабрыкі".

Але хто гэта будзе рабіць? У тэлебачанні прапаганда вабіць людзей, што Польшча на гэтым скарыстае. Пасол амерыканскі ў Варшаве сказаў, што ва ўзнагароду за помач аказаную ЗША атрымаем праўдападобна кавалак торту ў часе адбудоўвання Ірака. Слухаючы гэтае выказванне, на якое не дазволіў бы сабе пасол СССР Арыстаў, я падумаў, што ён аднёсся да нас як да падлаедаў. Тым больш, што гэта прапагандная мана, бо на гэтай адбудове наша дзяржава не скарыстае. Мы не маем ужо чым адбудоўваць Ірак. Польскія фірмы, якія калісь будавалі ў Іраку дарогі, ужо не існуюць. А тыя, якія асталіся пад старымі назвамі, з'яўляюцца ўласнасцю замежнага капіталу. Іх ужо даўно прадалі, калі не давялі да банкруцтва людзі, якія мелі палітычныя даўгі ў ЗША ці ў іншых капіталістычных дзяржавах. Так што польская дзяржава і яе грамадзяне не будуць мець ніякай карысці з адбудовы Ірака. Цацанка-абяцанка, а дурню — радасць.

**Дзмітры Шатыловіч**
18.05.2003

## ПАЛІТЫКА, ВЫБАРЫ І САМАЎРАДЫ

### Фэсты і паслы

Фэст у Вярхлессі — спецыяльнае прывітанне старышнёй БГКТ паслоў Станіслава Малішэўскага і Сяргея Плевы. Купалле ў Белавежы — а як?! — удзельнікам быў пасол Сяргей Плева. Цяпер пачатак лета. На колькіх яшчэ фэстах старшыня БГКТ будзе вітаць, як спецыяльных гасцей, паслоў? Парламентарыі кааліцыйнай партыі выкарыстоўваюць кожную нагоду для таго, каб будучыя выбаршчыкі ведалі, каго пакінуць на выбарчым бюлетэні. Так больш-менш ствараецца імідж палітыка.

Але штосьці тут не так. Трэба паставіць некалькі пытанняў. Фэсты з'яўляюцца культурнымі мерапрыемствамі Таварыства, якое карыстаецца фінансавай падтрымкай Міністэрства культуры і мастацтва. Інакш кажучы, паслы выкарыстоўваюць грошы падаткаплацельшчыкаў для партыйнай дзейнасці. Калі так, дык чаму ж такой нагодай не карыстаецца БДА (Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне — гэта для

тых, хто забыў, або не ведае гэтай абрэвіятуры)?

Другое істотнае пытанне ўзнікае само па сабе. Чаму паслы прычапіліся да БГКТ, як мухі да мёду? А можа наадварот? Які інтарэс мае БГКТ, каб папулярызаваць паслоў СЛД? Ці гэта дзякуючы ім арганізуюцца фэсты? Гэта ж аўчынка вырабу не варта. Колькі ж трэба пры гэтым натрудзіцца, наездзіцца па вёсках, каб Плева з таварышамі ўвайшлі ў Сейм. І найважнейшае пытанне: якую канкрэтную карысць мае грамадскасць вёсак і мястэчкаў усходняй Беласточчыны ад таго, што іх прадстаўніком з'яўляецца пасол Плева і яго сябры? Ці апошнім часам паменшала колькасць беспрацоўных? Ці селянін можа беспраблемна збыць сваю прадукцыю? А можа дзякуючы ім прыбыло дарог? А што ў галіне асветы і культуры зрабіў пасол? А што з беларускай культурай? Ці намагаецца ён заснаваць Беларускі інстытут культуры? Калі хтосьці сэнсоўна адкажа на гэтыя пытанні, буду яму ўдзячны за гэта, а суседа буду намаўляць галасаваць на левых дэмакратаў, а канкрэтна на пасла Плеву і таксама на спадара Я. Сычэўскага за палітычны нюх. Буду галасаваць за праграмай, а не супроць „Салідарнасці".

**Міхась Куптэль**
11.08.1996

### Хто да каго прычапіўся?

Гартаючы „Ніву" ад 11 жніўня г.г, я спыніўся на публікацыі Міхася Куптэля „Фэсты і паслы". Усё гэта праўда, што піша аўтар. Я скрупулёзна пераглядаю кожны нумар нашага штотыднёвіка і ніяк не магу здагадацца, з якой мэтай прысутнічаюць на беларускіх фэстах паслы Сяргей Плева і Станіслаў Малішэўскі.

Напрыклад, у Чаромсе падчас фэсту мы з Міраславам Навіцкім асабіста даручылі паслу Плеве справу мясцовай пажарнай каманды, якая па розных бюракратычных прычынах не можа дачакацца канчатковага вырашэння (аб гэтым дэталёва пісаў я ў артыкуле „Пажарнікі на паперы" ў „Ніве" ад 7 ліпеня г.г.). Прыгадаю толькі, што замест ліквідаванай з канцом 1994 г. чыгуначнай прафесіянальнай пажарнай каманады, згодна з распараджэннем старшыні Рады Міністраў ад 14 кастрычніка 1993 г., у Чаромсе павінна ўжо другі год дзейнічаць спецыялізаваная Jednostka Ratowniczo-Gaśnicza Straży Pożarnej.

Калі я яшчэ раней паказваў апублікаваны матэрыял пра па-

жарнікаў войту Міхасю Врублеўскаму, той мне сказаў: „Пачакайма да 14 ліпеня, да фэсту. Зацікавім справай пасла Плеву. Мо ён нешта дапаможа”.

Але да гэтай пары справа пажарнікаў не скранулася з месца. Відаць, ляжыць яна ў нейкага чыноўніка, глыбока схаваная пад сукном. Аж хочацца папытаць у арганізатараў фэстаў, ці паслы прыязджаюць толькі дзеля рэкламы сваёй персоны. На фэсце ў Чаромсе яны да публікі не прамаўлялі, даручаную выбаршчыкамі справу не вырашылі. Тады ж навошта яны прыехалі?

Міхась Куптэль піша, што паслы прычапіліся да БГКТ, бы мухі да мёду. А мне здаецца, што само Таварыства жадае гэтага і бачыць нейкую карысць у супольным сяброўстве. На маю думку, такая рэклама не прынясе станоўчых вынікаў у чарговых парламенцкіх выбарах. Я напэўна не буду галасаваць на парламентарыяў — удзельнікаў фэсту, якім не пад сілу справіцца з пастулатамі выбаршчыкаў.

**Уладзімір Сідарук**

1.09.1996

## Выбралі солтыса

Пятніца, 18 снежня 1998 года. У гэты дзень у прысутнасці прадстаўніка гміннай адміністрацыі ў вёсцы Бялкі адбыліся перавыбары солтыса.

На вясковы сход прыйшоў 21 жыхар. Прысутныя выбралі выбарчую камісію, а Галена Асташэўская — загадчыца ЗАГСа ў Нарве дапамагла правесці выбары згодна з абавязваючымі законамі. Удзельнікі схода сталі вылучаць кандыдатаў і тады аказалася, што адзіны кандыдат — гэта Сцяпан Семянюк, цяперашні солтыс. У ходзе закрытага галасавання ўсе аднагалосна падтрымалі ягоную кандыдатуру. Такім чынам Сцяпан Семянюк надалей будзе выконваць салтысоўскія абавязкі

Потым сабраныя сталі выбіраць, таксама ў закрытым галасаванні, вясковую раду. У яе састаў увайшлі солтыс Сцяпан Семянюк, малады гаспадар Віктар Краўчук і двое пенсіянераў: Міхал Амельянюк і Аляксандр Раеўскі. Гэты апошні таксама быў шматгадовым солтысам.

Калі ўдзельнікі сходу закончылі выбарчыя працэдуры, тады сталі абмяркоўваць вясковыя праблемы. Найбольш неадкладнай справай

з'яўляецца рамонт вясковай вуліцы і гравейкі Трасцянка—Бялкі—Агароднікі да вёскі Іванкі. З-за дрэннага стану дарог ПКС часта спыняе курсіраванне аўтобусаў на гэтай трасе. Жыхары Бялкоў вырашылі арганізаваць грамадскі чын пры рамонце палявых дарог і таму звярнуліся да войта гміны з просьбай дапамагчы дастаць бясплатна экскаватар. Жвір яны самі давязуць у патрэбныя месцы на сваіх трактарах.

**Мікалай Лук'янюк**
3.01.1999

## Пасля выбараў

Апошнія выбары ў Сейм і Сенат у нашай краіне бліскуча выйграла лявіца; інакш — посткамуністы. Адразу аднак магу супакоіць кожнага чытача „Нівы", што такія камуністы не страшныя, як бальшавікі перыяду Яжова, Берыі і пазнейшых правадыроў за мяжою. Наша лявіца мае дух Заходу і будзе выконваць кожны найменшы загад адтуль; інакш: будзем надалей жыць пад дыктоўку Амерыкі, Англіі, Германіі, Бельгіі... Наша лявіца з'яўляецца лявіцай толькі на паперы, а ў сапраўднасці яна адным мірам мазана, што і адышоўшыя з трэскам. Адны нажыліся, дык і тыя, што будуць правіць намі, таксама нажывуць вялікія фартуны і дзяржава неяк вытрымае гэтае ярмо. Польшча сёння з'яўляецца амаль калоніяй Заходу: амаль усе фабрыкі распрададзены чужому капіталу, а беспрацоўе далей будзе дамінаваць у нас.

А на каго я галасаваў? А вось: на жоўтай картцы аддаў я галасы на Яна Сычэўскага, Сяргея Плеву і на яшчэ аднаго, што прозвішча забыў. А на белай пад нумарам 4 аддаў я голас на Самаабарону А. Лепэра.

**Мікалай Панфілюк**
21.10.2001

## Напярэдадні выбараў

27 кастрычніка выбары да самаўрадаў. У Чаромсе, напрыклад, за пасаду войта будуць змагацца тры кандыдаты: цяперашні войт, мясцовы бізнесмен і радны апошняга склікання, асоба добра вядомая ў мясцовай грамадскасці. На каго і на што (якую праграму) будуць галасаваць чаромхаўскія выбаршчыкі пакуль-што невядома, паколькі прэтэндэнты на крэсла войта захоўваюць усё ў таямніцы. Адно думку войта Врублеўскага я пазнаў: „Выбарчых сходаў не буду

арганізаваць, — канстатаваў, — сустракаўся я з насельніцтвам на сходах, калі прад'яўляў рэалізацыю бюджэту за мінулы год. Вядома ім, што я зрабіў. Паўтарацца не стану".

— Скажыце, калі ласка, а што зрабілі б вы будучы войтам? — пытаю Лявона Селяха, чаромхаўскага бізнесмена.

— Шанц для Чаромхаўскай гміны бачу вялікі. Перад усім — прыгранічны гандаль і наладжанне сяброўскіх кантактаў з бізнесменамі суседняй Беларусі. Чаромха карыстаецца чыгуначным і дарожным пагранічнымі пераходамі. Побач Полаўцаў знаходзіцца 36 гектараў, якія з'яўляюцца ўласнасцю Агенцтва скарбу дзяржавы (мяжуюць побач чыгуначнай лініі Чаромха — Брэст). Мой сябра з Бельска, які з'яўляецца прадпрымальнікам фірмы KREKS, займаецца імпартам вугалю з Сібіры. Штомесячна прадае 20 тыс. тон апалу. Чаму ж бы гэты тавар не прапусціць праз чаромхаўскую станцыю? Мне вядома таксама, што сябрук зацікаўлены імпартам штучных угнаенняў і шчэбеню з Украіны. Ад 1991 года чаромхаўская станцыя закрыта для гандлёвых мэт. Спатрэбілася б пахадайнічаць, каб адмяніць гэты закон і вярнуць Чаромсе міжнародны статус для таварнага руху. Гэта справа тычыцца і дарожнага перахода ў Полаўцах. Нашай гміне неабходныя месцы працы. А такі шанц бачу ў разбудове мытні і пагранічнай стражы. Ад Тарэспаля па Белую-Падляшскую я налічыў сорак мясных складоў. Чаму б не арганізаваць прыгранічнага гандлю? Але бяда ў тым, што мясцовы самаўрад і законы, на якія спасылаецца, тармозяць усялякія з гэтым звязаныя інвестыцыі. Пераканаўся ў тым я асабіста, арганізуючы гандлёвую фірму. Каштавала мяне гэта шмат часу, нерваў і грошай.

Зараз на маім участку змяшчаюцца тры гандлёвыя ўстановы, у якіх працуе 13 чалавек. А ўчастак займае ўсяго шаснаццаць сотак. А якую інвестыцыю можна збудаваць на 36-ці гектарах? Патрэбны для Чаромхі стратэгічны інвестар і адпаведныя законы. Няважна, хто ён будзе: немец, галандзец ці француз. Для чарамшан асноўнае — праца. І апошняя справа. Нявыкарыстаныя памяшканні Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу — быўшага паравознага і вагоннага дэпо. Калі не знойдзецца чалавек, які задбаў бы аб іх выкарыстанні, дык незадоўга пападуць у руіну. А ці можна дазволіць на такое марнатраўства пры ўваходзе ў Еўрасаюз? Мне здаецца, што прадпрымальнікаў губяць высокія падаткі. У выпадку чаромхаўскай чыгункі спатрэбіўся б такі закон, які адмяніў бы задоўжанасць і дазволіў на

льготы на працягу прынамсі 5-10 гадоў. Ад мясцовага самаўрада многа залежыць. Хачу адно паказаць грамадскасці гміны, што ёсць яшчэ да выкарыстання магчымасці, якія нельга загубіць.

**Уладзімір Сідарук**
20.10.2002

### Першае пасяджэнне

Новаабраныя нарваўскія радныя сабраліся на першым пасяджэнні 19 лістапада. На пост старшыні Рады гміны прэтэндавалі папярэдні старшыня Мікалай Кандрацюк і настаўнік Яўген Дудзіч. Перамог гэты апошні — атрымаў 10 галасоў (ад 15 радных).

У кулуарах радныя пакрытыкавалі папярэдняга старшыню як за слабыя вынікі працы ў папярэднім скліканні, так і за тое, што на выбарах падтрымаў контркандыдата паўторна выбранага ў першым туры войта Якуба Садоўскага. Кандыдатка Выбарчага камітэта „Нарва — наш дом”, які ўзначальваў мясцовы бізнесмен, не атрымала належнай падтрымкі выбаршчыкаў.

**Мікалай Лук'янюк**
29.12.2002

### Новы солтыс і новыя накірункі дзеяння

Вечарам 24 студзеня ў Пачатковую школу ў Старым Ляўкове прыйшло 78 жыхароў вёскі Новае Ляўкова — на выбары солтыса і салэцкай рады. Сяло зараз налічвае 264 жыхары, а яго солтысам быў Ян Стоцкі. Паўнамоцтвы солтыса закончыліся і жыхары вылучылі пяць кандыдатаў на гэты пост. У першым туры галасавання Ян Стоцкі і Мікалай Лаўрашук атрымалі па 25 галасоў. У другім туры значную перавагу над сваім сапернікам атрымаў Мікалай Лаўрашук — аддалі на яго 40 галасоў.

У склад новаляўкоўскай салэцкай рады аднагалосна былі выбраны: Мікалай Лаўрашук, Ян Стоцкі, Лявон Максімюк, Марыя Целушэцкая і Альжбета Сахарчук. Рада і солтыс будуць сачыць за ходам работ пры пабудове санітарнай каналізацыі ў цэнтры вёскі, а таксама водаправоднай лініі да хутароў. У вёсцы патрэбны тратуар, хаця б на адным баку вуліцы. Дагэтуль праклалі яго тут няшмат. Неабходна адрамантаваць пачакальню на мясцовым аўтобусным прыпынку ПКС (пабіты ў ёй і дзверы, і вокны). Трэба ра-

біць намаганні, між іншым, дзеля таго, каб Тэлекамунікацыйны раён у Гайнаўцы абмяняў няўдачлівы вулічны тэлефон-аўтамат у Новым Ляўкове (псуецца 2-3 разы ў тыдзень).

У той выбарчы вечар сяляне шмат аб чым дыскутавалі ды разважалі. На іх пытанні адказвалі кіраўнік гайнаўскага Павятовага бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі (АРіМР), прадстаўнік Дарадчага асяродка сельскай гаспадаркі (ОДР) у Гайнаўцы ды сакратар Гміннай управы ў Нараўцы. Апошні з іх расказаў між іншым пра новыя інвестыцыі на тэрыторыі Нараўчанскай гміны.

Можа новы солтыс будзе ладзіць больш вясковых сходаў? Сяляне з Ляўкова хочуць больш ведаць, што іх чакае, калі Польшча далучыцца да Еўрасаюза. Прадстаўнікі АРіМР ды ОДР прапанавалі арганізаваць спецыяльныя курсы і абучэнне. Абяцалі таксама ва ўсім дапамагчы. Дарэчы, зараз у зімні перыяд у сялян на гэта хапіла б часу.

**Янка Целушэцкі**
9.02.2003

## У Арлянскай гміне зноў выбары

Вельмі коратка давялося быць гмінным радным аднаму з членаў 15-асабовай Рады гміны Орля Мікалаю Б. 19 студзеня на надзвычайным пасяджэнні Рада прыняла рашэнне пра заканчэнне ягоных паўнамоцтваў. Прычынай гэтаму быў прысуд Гродзкага суда, які адабраў яму вадзіцельскія правы за язду „на падвойным газе”. У той апальны дзень, у дзень выбараў, шафёра-раднага чакала паліцыя недалёка яго дома; вяртаўся ён з суседняй вёскі, ад сваіх выбаршчыкаў. Верагодна, нехта данёс на асобу публічнага даверу.

У арлянскім асяроддзі гаворыцца таксама пра абцяжарванне падаткаплацельшчыкаў лішнімі затратамі. Рада магла адклікаць раднага крыху пазней, на звычайнай сесіі; надзвычайная сесія каштуе каля 4 тысяч злотаў, а правядзенне чарговых выбараў будзе каштаваць далейшыя 10 тысяч. Цікавае і тое, што адкліканы радны мае поўнае права балаціравацца і, магчыма, стаць радным...

Дзеля высвятлення такой справы патэлефанаваў я ваяводскаму выбарчаму камісару, ад якога пачуў такое тлумачэнне: Ваявода прыняў рашэнне правесці дадатковыя выбары 6 красавіка 2003 года. Асоба, адкліканая з функцыі раднага, мае пра-

ва балаціравацца, бо закон абавязвае адклікаць раднага, калі той у час кадэнцыі дапусціцца злачынства і будзе пакараны законным прыгаворам. Людзі ведаюць, што тая асоба здзейсніла незаконны ўчынак і калі выйграе выбары, можа стаць радным. І калі б зноў наскандаліў, тады зноў трэба яго адклікаць.

**Міхал Мінцэвіч**
2.03.2003

### Малая зацікаўленасць выбарамі

У Арлянскай гміне яўка выбаршчыкаў на выбарах дэпутатаў у Еўрапарламент была амаль найменшая ў Бельскім павеце (перадапошняе месца). Але гэта можна лічыць поспехам, калі ўлічыць еўрапейскі рэферэндум: тады Арлянская гміна заняла апошняе месца ва ўсім Падляшскім ваяводстве.

Арлянская гміна налічвае 3 700 жыхароў, з ліку якіх 3 165 асоб мае права выбіраць дэпутатаў. Але 13 чэрвеня пакарыстацца гэтым правам хацелася нямногім. На выбарчыя ўчасткі, хаця ў вёсках выбаршчыкаў чакалі школьныя аўтобусы, з'явілася толькі 314 чалавек, што склала 9,92% ад агульнага ліку выбаршчыкаў.

На тэрыторыі гміны працавалі чатыры выбарчыя ўчасткі — два ў самой Орлі і па адным у Дыдулях і Пашкоўшчыне. На выбарчым участку № 3 у Пашкоўшчыне, дзе членам выбарчай камісіі быў ніжэйпадпісаны, галасавалі жыхары Пашкоўшчыны, Тапчыкал, Кошак, Градалёў і Малінік. На агульны лік 660 выбаршчыкаў прагаласавала толькі 45 чалавек. Жыхары вёсак, відаць, не хацелі пакарыстацца дармовым транспартам, бо з Малінік на аўтобусе прыехала толькі 5 чалавек.

Самая вялікая яўка выбаршчыкаў была на ўчастку № 1 у Орлі — 12,43%. Адкуль такое малое зацікаўленне выбарамі?

— Выбары былі слаба распрапагандаваны, а выбаршчыкі не мелі магчымасці асабіста пазнаёміцца з кандыдатамі ў дэпутаты Еўрапейскага парламента, — лічыць сакратар гміны Ірэна Адзіевіч.

Апытаныя мною людзі найчасцей тлумачылі, што страцілі веру ў сілу выбарчага бюлетэня. Арлянскія выбаршчыкі галасавалі на амаль усе партыі — апрача Польскай нацыянальнай партыі і Агульнапольскага камітэта ОКО. У гміне перамагла Самаабарона — 74 галасы, з чаго Баляслаў Барысюк атрымаў 44 галасы. На другім месцы апы-

нулася Польская сацыял-дэмакратыя — 52 галасы, з чаго 50 галасоў сабрала Анна Бурыла. Трэба адзначыць, што гэтыя два кандыдаты наведалі Арлянскую гміну. СЛД апынуўся на трэцім месцы з 45 галасамі (найбольш галасоў атрымала Зофія Транцыгер-Кочук). Варта адзначыць, што стараста Бельскага павета, які балатаваўся са спіска Нацыянальнага выбарчага камітэта, атрымаў толькі 18 галасоў.

**Міхал Мінцэвіч**
27.06.2004

## Не галасавалі

Апошнім часам усе наракаюць на нізкую яўку выбаршчыкаў. І слушна. Толькі каб у будучыні зрабіць іх больш актыўнымі, недастаткова сказаць, што „на вёсцы на выбарчыя ўчасткі традыцыйна ходзіць менш выбаршчыкаў, бо вясковы электарат менш адукаваны і менш зацікаўлены палітыкай" (так заявіў праф. Эдмунд Внук-Ліпінскі 9 кастрычніка г.г. па першым канале Польскага тэлебачання), але задумацца над сапраўднымі прычынамі такога стану. У гарадах людзі маюць блізка да выбарчых участкаў, бо ў шчыльна заселеных мясцовасцях іх звычайна больш. Іншая справа на вёсцы. Мне надта цікава, ці старыя і хворыя або папросту лянівыя гараджане пайшлі б прагаласаваць, калі б давялося ім пераадолець некалькі кіламетраў у адзін бок? І да гэтага пехатою або на ровары, бо ў выхадныя па вясковых дарогах курсіруе штораз менш аўтобусаў ПКС, а не ў кожнага вясковага пенсіянера ёсць свая машына.

Возьмем для прыкладу Нурэцкую гміну. На выбарчы ўчастак у Нурцы-Станцыі жыхарам Машчоны-Панскай, Вакулавічаў, Сычоў, Грабаркі ці Шумілаўкі трэба дабірацца па сем — адзінаццаць кіламетраў. І ні пры чым тут адукацыя — папросту мала каму стае сілы, каб пераадолець такую дыстанцыю ў адзін бок. А дадому таксама трэба ж вярнуцца!

У гэтым канкрэтным выпадку Гмінная выбарчая камісія павінна адкрыць дадатковы выбарчы ўчастак, напрыклад, у святліцы ў Машчоне або ў доме для састарэлых у Грабарцы. Неўзабаве чарговыя самаўрадавыя выбары. Трэба аб гэтым памятаць, каб зноў не наракаць на абыякавасць выбаршчыкаў!

**Марк Цыбарт**
30.10.2005

# ВЁСКА: РЭГРЭС З ПРАГРЭСАМ

## У самай маладой вёсцы

Узнікла яна ў 1982 годзе ў Нараўчанскай гміне, непадалёк Семяноўскага вадасховішча. Новая Лука... У сувязі з пабудовай штучнага возера з паверхні семяноўскай акругі зніклі пяць вёсак, у тым ліку вялікая вёска Лука, распаложаная над ракой Нарвай. Не ўсе ранейшыя жыхары затопленых вёсак павыязджалі. Некаторыя лучане сталі дамагацца праекту на закладзіны новай вёскі паблізу „вялікай вады”. Прыйшлося ім чакаць чатыры гады. Былі гэта: Мікалай Стоцкі (першы солтыс у гэтай вёсцы), Ян Байчук, Сяргей Каральчук, Канстанцін Самоцік ды Валянціна, Фёдар і Уладзімір Харкевічы.

— Зараз у Новай Луцэ дзевяць тыповых сялянскіх сядзібаў і ажно каля 100 курортных домікаў. Тут адна вуліца — гравейка і шмат перасякаючых яе так званых грунтовых, найчасцей пясчаных дарожак. Домікі пабудавалі сабе блізка вадасховішча жыхары Беластока, Варшавы і нават Сілезіі. Гэта перш за ўсё лекары і паліцыянты, — паінфармаваў малады солтыс Яраслаў Стоцкі, які абавязкі галавы вёскі выконвае ў Новай Луцэ ўжо другую кадэнцыю.

— Мясцовыя сяляне гадуюць перш-наперш малочных кароў. Маем удоволь зялёных угоддзяў, між іншым на тарфяніках у ваколіцы вёскі Церамкі. Малако возяць у бліжэйшую злеўню ў Тарнопалі, — распавядаў солтыс. — У новапабудаванай вёсцы маем электрычнае святло і ваду з крана. Улетку будзе адкрыта прыватная прадуктовая крама. У плане пабудова калектараў, якімі паплылі б сцёкі з Тарнопала і Новай Лукі да існуючай ужо ачышчальні ў Багнюках. Некаторыя жыхары самай маладой у гміне, а, мабыць, і ў Беластоцкім ваяводстве, вёскі ў бліжэйшы час запланавалі купіць сабе навінку, якая сюд-туд прыжываецца — спадарожнікавыя антэны.

Сям’я Стоцкіх у Новай Луцэ — людзі працавітыя, добрыя гаспадары. Гадуюць лепшай пароды кароў, забяспечваюць іх лепшымі кармамі. Малачарскаму заводу ў Гайнаўцы прадаюць яны штогод 40 тысяч літраў малака ў еўрапейскім класе. Кожны дзень на іх панадворак прыязджае аўтацыстэрна гайнаўскай ОСМ.

Яраслаў Стоцкі закончыў у 1990 годзе Галоўную школу сельскай гаспадаркі ў Варшаве і здабыў прафесію ляснічага. Працуе ў Лясніцтве Крыніца (Надлясніцтва Броўск) у Нараўчанскай гміне. Ён не захацеў ехаць у горад. Яму і на вёсцы добра. Ёсць у яго жонка, дзеці. Жыве ў адным з самых прыгожых дамоў у вёсцы.

**Янка Целушэцкі**

18.02.1996

## Была ў Грабаўцы школа

З канцом школьнага года спыніла сваю дзейнасць Пачатковая школа ў Грабаўцы Дубіцкай гміны. З гэтага выпадку нялішне будзе прыпомніць гісторыю школьніцтва ў гэтай вёсцы.

Ужо ў 1917-1919 гадах у Грабаўцы існавала беларуская нацыянальная школа, а настаўніцай у ёй працавала Вера Матэйчук. У ліку яе вучняў быў таксама брат маёй бабулі Сямён Васілюк (бабуля распазнала яго на здымку з тамтых часоў).

Пасля II сусветнай вайны шматгадовым дырэктарам школы быў Рышард Масілевіч, які працаваў у Грабаўцы з жонкай Зофіяй да паловы васьмідзесятых гадоў. Жылі яны ў школьным будынку, у якім размяшчаліся яшчэ бібліятэка, настаўніцкі пакой і VIII клас. Астатнія класы знаходзіліся ў прыватных будынках, раскінутых па ўсёй вёсцы. У шасцідзесятых гадах распрацаваны быў праект будовы новай школы ў паўднёвай частцы Грабаўца, пры дарозе ў Кляшчэлі. Аднак новы драўляны будынак школа атрымала толькі ў 1986 годзе. Паставілі яго пры старой школе за кошт Фонду народнага чыну дапамогі школе і пры падтрымцы жыхароў Грабаўца і Елянкі. У ім былі чатыры класы, а на гары — настаўніцкі пакой, дырэктарскі кабінет і бібліятэка. Дзесяць гадоў дзеці карысталіся новым будынкам. У старым школьным будынку апошнім часам жыла настаўніца матэматыкі з сям'ёй. Апрача таго арганізавалі ў ім сціплы спартыўны зал і дашкольны клас (т.зв. нулявы).

У школе працавалі многія настаўнікі, большасць якіх жывуць цяпер у Гайнаўцы і наваколлі, а таксама ў Беластоку. Дырэктарамі школы пасля Рышарда Масілевіча былі Галіна Галёнка, затым Аліна Новік і Ірэна Асіпюк. З шасці настаўніц, якія працавалі тут да ліквідацыі школы, толькі дзве атрымаюць працу ў Дубічах-Царкоўных.

Астатнім пагражае беспрацоўе. Старожка пасля водпуску стане працаваць ва Управе гміны.

На ўспамін жыхарам Грабаўца засталіся толькі два школьныя будынкі, аб лёсе якіх прыйдзецца рашаць радным Дубіцкай гміны.

**Славамір Кулік**

11.08.1996

## Усе наракаюць

Селянін з багатай вёскі Грыша Мароз, рабочы-пенсіянер Уладзімір Сідарук і інтэлігент-пенсіянер Васіль Петручук глядзяць на навакольную рэчаіснасць вачамі тэлебачання. І ўсе наракаюць. Ніякай радасці, а толькі турботы. Грыша Мароз хвалюецца таму, што „сяляне (...) ужо разбагацелі: свірны поўныя збожжа, капцы трашчаць ад бульбы". Некалькі радкоў ніжэй піша: „Людзям жывецца штораз горш. І ў горадзе, і на вёсцы, усюды аднолькава". Не ўсім, піша Мароз, але большасць „канцы з канцамі ледзь зводзіць". Нараканне гэтае разумею так: брак грошай і на вёсцы, і ў горадзе. Свірны поўныя, але грошай няма. Можа непатрэбна гэта прыпамінаю, але восенню дзяржава купляла і збожжа, і бульбу, але няхай будзе па-Грышаваму, што ад прыбытку галава баліць. Аб тым, як жывецца ў горадзе, Грыша Мароз ведае з тэлебачання, калі піша, што „ў горадзе, калі бяда прыпячэ, людзі маюць як ратавацца: за транспаранты і на вуліцу!" Шкада, што я аб гэтым не ведаў, можа і мне палепшылася б, калі б выйшаў на вуліцу з транспарантам.

Рабочы-пенсіянер турбуецца з-за вандалізму сучасных хуліганаў, якія разбураюць чыгуначныя прыпынкі, абліваюць фарбамі грамадскія ўстановы ці замуроўваюць жывых людзей у будынку. Праўда. Трэба аб вандалізме пісаць. Але Уладзімір Сідарук прычыны вандалізму бачыць у дэмакратыі: „На маю думку, цяперашняя дэмакратыя ні ў чым не розніцца ад камуны". Значыць, за камуны таксама быў „вандалізм і анархія"? Не разумею. З аднаго боку, у час камуны будаваліся „дарогі, школы, святліцы...", і гэта добра, з другога боку — дэмакратыя не розніцца ад камуны, значыць, таксама будуюць „дарогі, школы, святліцы"? Толькі вандалізм дакучае, ці як? Адным словам, усё паблытана ў карэспандэнцыі. Так як у тэлебачанні. У ім ёсць усё і аб усім таксама і ў допісе Уладзіміра Сідарука.

Васілю Петручуку немагчыма забыцца пра сваё дзяцінства. Праў-

да, кожны меў якоесьці дзяцінства — горшае, лепшае. Але ці аб гэтым трэба пры кожнай нагодзе прыпамінаць? Мажа і так, але мажа і не.

Грыша Мароз крануў вельмі важную справу збыту сялянскай прадукцыі. Выхадам не мажа быць прапанова карэспандэнта, каб дзяржава скупляла ўсё тое, што селянін мае ў свірнах. Гэта ўжо было. Дзяржава мае ствараць умовы сельскай гаспадарцы, а збытам і прадукцыяй мае займацца селянін або залежны ад яго пасрэднік. Бульбу, збожжа, мяса можна перапрацоўваць на прадукты на месцы. Трэба стварыць толькі адпаведную інфраструктуру. Але, думаю, справа ў адным слове „толькі". Каб гэта стварыць на месцы, вёсцы патрэбны розум і капітал, а не нараканне. Чытаю, што мільёны долараў заграмічнай помачы на развіццё інфраструктуры ляжаць у банках нявыкарыстанымі. Чаму? Мажа таму, што лепш наракаць на дэмакратыю.

**Міхась Куптэль**
1.06.1997

## Камуна вінавата

Мне і ў галаву не прыйшло і да гэтай пары не разумеў усяго. Адно толькі думаў: „Кепскі час для вёскі настаў. Улады вінаваты. Відаць, аб гэтай галіне гаспадаркі прызабылі". А тут маеш табе, усяму мы самі вінаваты. Значыць, ад нас, мужыкоў, бяда вылазіць. А чаму? А таму, што мы розуму не маем, не ўмеем на вёсцы жыць. Усё гэта растлумачыў мне Міхась Куптэль. Не верыце? Пачытайце „Ніву" ад 1.06.1997 года. Паводле яго, нават тэлебачанне аглядаць як разумныя людзі не патрапім. Вось якія мы мужыкі! На адукацыю нам пэўна ўжо не пара, перамяніць нас ужо цяжка, а і паміраць нам яшчэ таксама ранавата. Адно астаецца, прымкнуцца і другім не мяшаць. Так думаю і зрабіць. Аднак перад гэтым, думка адна не дае мне спакою.: „Камуна ўсяму вінавата". Пры яе панаванні, разумныя людзі з вёсак у гарады паўцякалі, а на вёсках асталіся такія астапопы як я. Розуму не маюць і жыць не патрапяць як след ды толькі наракаюць. Нават не ведалі, што ў апошнюю восень на Гайнаўшчыне бульбу ад мужыкоў куплялі. Вось цемната! А ж мусеў нам аб гэтым Міхась Куптэль напамінаць, які сваё гняздзечка звіў дзесьці над морам. Аднак аб справах мужыцкіх на Гайнаўшчыне ведае лепш за нас. Вось талент! Аж шкада, што такія людзі ў гарадах марнуюцца,

а вёска не выходзіць на шырокія воды. Відаць, з горада сялянскія справы лепш вырашаць. І зноў тут бяда. Запозна нам аб скупцы ён паведаміў. Бульбы ўжо мала асталося. Тая, што асталася або спакойна гніе, або кароўкамі скармляецца, хаця аб такім корме на вёсцы ўвосень не думаў ніхто. Вось так жыве неразумны мужык. А можна наладзіць усё і то хутка. Прапаную Вам, спадар Міхась Куптэль, вярнуцца на вёску. Тут Вас чакае ўсё: байкаватая бацькаўская хата, свая гаспадарка. Палеткі, калі хтосьці не арэ, дык пэўна, ляжаць аблагом. З Казахстана едуць да нас людзі, каб багата жыць. Вы вось доўга не думайце, толькі прыязджайце. Пастарайцеся нам паказаць, як пры цяперашніх уладах можна багата жыць, як інфраструктуру сваю развіваць, як долары з банкаў браць і перапрацоўчыя прадпрыемствы будаваць. Пакажыце, што можа зрабіць чалавек з галавой. Прызнаюся адкрыта, яшчэ падобнага чагосьці ў нас не відаць. А сялянскіх прадуктаў не будзе трэба Вам далёка шукаць. Малаком, мясам і збожжам дурныя сяляне заваляць Вас, а Вы толькі перапрацоўвайце і грошы лічыце, бо неразумны мужык толькі працуе як вол, а далей не ведае з чаго пачынаць. Падумайце над маёй прапановай, пакіньце свой горад і пакажыце, як трэба жыць з галавою. Сідаруку раіце як мае пісаць, Петручуку падказваеце, каб дзяцінства забыў. Усё не па думцы вашай пішуць. Нічога не зробіш!. Як хто навучыўся, так будзе пісаць, а як лёс пакіруе, так прыйдзецца пражыць! Усім не дагодзіш.

А мне здаецца, што як чалавек думае, так няхай піша. Гэта воля яго. І дзякуй за гэта, што такога часу дачакалі, што можам пісаць тое, што хочам. І за гэта трэба Бога хваліць, што даў нам магчымасць у такі час пажыць.

Мы аднак нічога не пераменім, каб аднолькава жыць. Адзін пражыве багата, другі ледзь канцы зводзячы. Адно толькі цешыць, што на канец жыцця адно ўсіх чакае! Шкада толькі, што жыццё так хутка ляціць і прыпынку не мае. Вось ужо і па вясне, і лета перад намі. А там і восень, і год ужо за намі. Не аглядзеліся, калі і адзін годзік прыбыў за спіною. А гадоў не затрымаюць ні грошы, ні слава. Цяпер так яно ёсць і ад вякоў так бывала. А тут мы яшчэ папраўляем другіх, хаця часу не маем паглядзець на саміх сябе.

**Грыша Мароз**

22.06.1997

## Павольная смерць крамаў

У колішняй вёсцы Лука і ў Тарнопалі-Калоніі над Семяноўскім вадасховішчам красавалі прыгожыя беласценныя крамы нараўчанскага ГСу. Прайшоў нейкі час. І вось знеслі вёску Луку, але будынак крамы астаўся на беразе. Ну, зараз толькі шкілет будынка. Цяпер у ім няма ні акон, ні дзвярэй. Вырваны са сцен — як кажуць, жыўцом — электраўстаноўка і вадасцёкавыя трубы. Вандалы, а можа звычайныя грабежнікі, раструшчылі таксама ўнутраныя сцены. З іх усяго адзін друз... А на сценах і нават на століі надпісы — „насценная паэзія”.

Не ў лепшым стане таксама былая крама ў Тарнопалі. Тут яшчэ два гады таму было двое дзвярэй. На падлозе валяецца куча друзу, пустыя бутэлькі, слоікі і кансервавыя бляшанкі.

На душы робіцца моташна, калі гляджу на вышэйзгаданыя крамы. Успамінаю былога прэзэса ПЗГСу Кастуся Майсеню, неўтаймаванага будаўнічага такіх аб’ектаў ва ўсёй Гайнаўшчыне. Ніколі б раней і ні з кім ён не згадзіўся б, што можа так усё скончыцца.

Нараўчанскі ж ГС існуе! Дык чаму ж такі лёс наканаваны гэтым крамам?

**Янка Целушэцкі**
23.11.1997

## Падарунак пад ёлку і іншыя разважанні

Гмінная ўправа Гайнаўкі жыхарам Старога Беразова і Махнатага паднесла пад ёлку падарунак: каналізацыю і ачышчальню сцёкаў. Аб гэтым яшчэ некалькі гадоў назад ніхто і не марыў. Ажыццявіліся мары ў лістападзе 1997 года. Ачышчальня працуе, сцёкі з гэтых вёсак не забруджваюць навакольнага асяроддзя. Хтосьці можа запытаць: чаму менавіта ў гэтых вёсках? А таму, што гэта найбольшыя вёскі ў Гайнаўскай гміне, найбольш прадукцыйныя. Тут асталося найбольш моладзі на гаспадарках і яны ў асноўным папаўняюць бюджэт гміны. Таму Гмінная рада адобрыла праект пабудовы каналізацыі і ачышчальні сцёкаў у абедзвюх вёсках.

У красавіку мінулага года пачалі капаць канавы, а ў лістападзе ўжо здалі ў карыстанне чатыры кіламетры каналізацыі і прыгожы домік, у якім адбываецца цыкл ачысткі сцёкаў паводле нарвежскай сістэмы. Людзі карыстаюцца выгадай дзякуючы нашай

нястомнай спадарыні войт Вользе Рыгаровіч. Адна яна толькі ведае, колькі гэта каштавала нерваў, турбот і, можа, недаспаных начэй? Аднак яна на сваім паставіла і ўсё давяла да канца. Нізкі ёй паклон ад нас. Гэта ж табе не кавалак асфальту палажыць, ці якую палявую дарогу паправіць. Тут грошы лічацца не ў тысячах, а ў мільёнах. Прадпрыемстваў вялікіх у нас няма, каб з іх пацягнуць, спонсараў таксама няма, а з сялян многа не пацягнеш. Трэба было не ў адным ведамстве парогі абіваць і то не адзін раз. І хаця наша спадарыня войт страціла са свайго жыцця некалькі гадоў, аднак даказала, што жанчына можа кіраваць управай гміны яшчэ лепш, чым такі-сякі мужык. А ў нас гэта відаць не на словах, а на практыцы. Пераканацца аб гэтым можа кожны, хто праедзе праз вёскі Гайнаўскай гміны. Аднак чалавек усім не дагодзіць. Калі людзям зробіш дабро, хутка аб ім забываюць. Можна гэта прыкмеціць у нашым штодзённым жыцці. Крыўду чалавек даўжэй памятае і стараецца за дабро адплаціць злом. Гэта ўжо такая чалавечая ментальнасць. Людзі парабіліся самалюбнымі, адны другім не давяраюць.

Пачуў я калісьці такую размову: „Калі не можаш дапамагаць, дык не мяшай працаваць". Разумныя словы. Хачу іх накіраваць да тых людзей, якія самі ў жыцці часта так паступаюць. Калі б адны другім дапамагалі, можна было б больш зрабіць і тады спакайнейшае было б жыццё. Гэта датычыць і некаторых жыхароў Гайнаўскай гміны. А яшчэ зрабіць у гміне асталося шмат чаго. У планах школа ў Дубінах і клуб, тэлефанізацыя і газіфікацыя ўсёй гміны. Газаправод жа будзе праходзіць праз тэрыторыю гміны і як тут не скарыстаць гэту нагоду. Трэба, каб быў добры гмінны самаўрад, з добрым, гаспадарлівым кіраўніком. Знаем усе, што Захад нам дармавых грошай не падкіне. Таму добрага войта трэба трымаць як найдаўжэй. Тады ён гміну так моцна раскруне, што і Захаду не будзем саромецца.

Папросім Госпада, каб нам паслаў здароўе і спакой, а мы самі ў сябе дабрабыт збудуем. Жадаю ўсім пачаць яго ўжо будаваць з пачаткам 1998 года. Даволі ўжо чакаць, таму што і так далёка мы асталіся ззаду.

**Грыша Мароз**

4.01.1998

## Нявыкарыстаныя фонды

Можа я і з'яўляюся, як кажуць, непапраўным аптымістам, але інтуіцыя мне падказвае, што трыкутнік Бельск—Гайнаўка—Нарва дасягне большы ўзровень развіцця, чым іншыя часткі ўсходняй Беласточчыны, дзякуючы добрым землям і працавітасці яго жыхароў. І хоць Грыша Мароз сцягваў на зямлю непапраўнага аптыміста і дылетанта ў справах сялянскага гаспадарання, то аднак, думаю, не утопіяй з'яўляюцца мае думкі, звязаныя з прагрэсам гэтага трыкутніка. Тым болей, што супадаюць не толькі думкі, але і дзеянні з „пазітывісцкай працай" Беларускага саюза ў беларускім асяроддзі.

Вандруючы па мясцовасцях Гайнаўшчыны, бачыўшы вялікі кантраст сялянскага жыцця ў розных вёсках, дайшоў я да вываду, што шанцам развіцця беларускай грамадскасці з'яўляецца згаданы трыкутнік. А калі я прачытаў яшчэ, што іншыя людзі — не лепшыя гаспадары чым нашы беларусы з Беласточчыны, добра выкарыстоўваюць дзяржаўную і еўрапейскую фінансавую і арганізацыйную дапамогу для развіцця свайго рэгіёна, падумаў: чаму ж нашым гэтым не пакарыстацца. Розныя фонды аж просяцца, каб мільёны долараў выкарыстаць на актывізацыю нашых „трыкутнікаў". Для актывізацыі патрэбны тры рэчы: ахвотныя і вопытныя людзі, грошы і добрыя землі. Грошы, як я ўжо сказаў, ёсць, і не толькі ў банках, у сялян, добрыя пшанічныя землі таксама ёсць. А вось з людзьмі слабавата, асабліва вопытнымі, адкрытымі, мудрымі і маладымі. І такіх, у якіх перспектыва дзейнасці не абмежавана да ўласнага панадворка ці абы-якой пасады, на якой толькі душацца.

Я з Ленай Глагоўскай пабыў толькі адзін дзень у сталічнай Варшаве, калі мы стараліся здабыць грошы на Летнюю школу беларусістыкі, і здабыў многа інфармацый пра ўстановы, якія толькі і дзеля таго былі створаны, каб паказаць мужыкам — працоўным і беспрацоўным, адукаваным і цёмным, такім, якія нешта гадуюць і абрабляюць зямлю. Пыталі мяне, каго я рэпрэзентую. Ну як жа каго, „Хатку"! Добра, казалі, паможам збудаваць дом, выгадны, еўрапейскі. Як, у Гданьску? — Мая „Хатка" ў Гданьску. А мяне цікавяць толькі магчымасці будавання, актывізацыі ў кутку Беласточчыны, у трыкутніку. Пыталі мяне, чаму я з Гданьска цікаўлюся трыкутнікам; ці там няма зацікаўленых? — Можа і ёсць, але баяцца запытацца нават, а каб яшчэ будаваць?! Ім і так добра ў іх ма-

лых айчынах, тым болей гмінным ураднікам, каб толькі не парушаць іх спакой. Дайшлі да пасад і больш не трэба. Інакш, трэба бегаць, ездзіць, ваяваць з бюракратыяй, актывізаваць. А ўрэшце і так ніхто добрага слова не скажа. Маем вольную гаспадарку, затым няхай тонамі бульбы, збожжа, мяса, фруктаў клапоціцца селянін, бо навошта ўсяго дабра столькі натварыў! Яго дабро, яго клопат. Каб даў яшчэ іншым зарабіць, а то скупіцца і на пасрэднікаў рабіць не будзе!

І так яно круціцца. А для гешэфту падставы ёсць — добрая зямля і куча нявыкарыстаных грошай!

**Міхась Куптэль**
11.01.1998

## Спадарожнікавыя рэфлексіі

Адзін мой сусед мае спадарожнікавую антэну, другі таксама. А вось, бачу і трэці купіў. А я што, горшы за іх? Якраз атрымаў прэмію ды доўга не думаючы, абзавёўся „талеркай" і я. Першы тыдзень сядзеў я перад тэлевізарам аж да світанку. Ноч у ноч! Нарэшце прыйшла рэфлексія — дурны я, ці што? Ноч траціць на нейкія там фільмы, а ўдзень хадзіць ледзь людзей бачачы? Пачаў глядзець перадачы нармальна, выбіраючы, як дагэтуль, толькі тыя, што мяне могуць зацікавіць.

Раней мне думалася, што калі буду мець спадарожнікавую антэну, мой кругагляд пашырыцца, глыбей зазірну ў свет. Аказваецца, што не! Усе цікавейшыя здарэнні ў свеце паказваюць амаль усе тэлестанцыі — ці то польскія, ці замежныя. Тое самае датычыць фільмаў, тэлесерыялаў. Яны табуном перакочваюцца па ўсіх каналах. Я хутка пераканаўся, што свет — гэта малая мясціна. Усе аб усіх даведваюцца ўсяго ў той жа час.

Другое, што мяне „засякло", гэта тое, што польскія тэлеперадачы зусім не горшыя за замежныя. А дагэтуль мне здавалася, што яны найгоршыя ў свеце! Усюды поўна звычайнай балбатні. Аднойчы „пераехаўся" я па ўсіх з лішкам трыццаці каналах і амаль усюды мог паглядзець „гаворачыя галовы", за выключэннем музычных і канала моды.

Іншая мая рэфлексія звязана з адсутнасцю польскай тэмы ў замежных перадачах. Пачынаючы з 19 сакавіка, калі я пачаў карыстацца спадарожнікавай антэнай, толькі два разы (якраз на канале „DW") мільганулі кароценькія рэпартажы на тэму непаладкаў у ахове асяроддзя ў ваколіцы Плоцка і недзе пад Шчэцінам. Мы

тут, у сябе, проста шкуру адзін з другога здзіраем, а ў свеце ніко-га гэта не цікавіць. А пра Беларусь ніхто і не заікнецца, быццам яна не існуе. Каб не нашы сродкі масавай інфармацыі, я б забыўся, як выглядае наш славуты Аляксандр Лукашэнка.

Наканец хачу сказаць, што толькі цяпер я пераканаўся, што значыць веданне замежных моў. Калі іх не ведаеш, тады глядзіш на тэлевізар, як той вол на маляваныя вароты. У рэшце рэшт абмяжоўваешся толькі да музычных ці прыродазнаўчых перадач. Ну, і яшчэ да эратычных фільмаў ці перадач, у якіх больш важнае што бачыш, чым тое, што чуеш!

Усё ж, нягледзячы на ўсё вышэйсказанае, не шкадую, што абзавёўся спадарожнікавай антэнай. Ці адна цацка больш можа пашкодзіць?

**Пётр Байко**
10.05.1998

## Ад гаспадара да стала

Усе сродкі масавай інфармацыі паведамляюць, што сяляне жывуць за рысай убоства, ніжэй сацыяльнага мінімуму. І гэта праўда! Земляробу цяжка прадаць свае прадукты, а калі ўжо адкрыюць дзе-небудзь пункт скупкі, то плацяць вельмі мала. Улады абяцалі, што за тону жыта будуць плаціць 360 злотых, а пшаніцы — 540 злотых. Аднак некаторыя пункты плацяць па 28 грошаў за кілаграм жыта.

У аўтакраме за 0,50 кг. буханку хлеба трэба заплаціць 0,80 злота. Вельмі проста палічыць, што пакуль прадукт трапіць на стол, ён становіцца ў дзесяць і больш разоў даражэйшы за сырэц. Але не адным хлебам жыве вясковы чалавек. Возьмем мясныя вырабы. Малады ялаўняк каштуе 2,40-2,80 зл. за кілаграм, старое быдла — 2,00-1,60 зл., свініна — 3,30 зл. Але ўжо ў краме мясныя вырабы каштуюць надта дарага. За сасіскі трэба ўжо заплаціць 8,60 зл. за кілаграм, а за „звычайную” — 10,80 зл. Гатовыя вырабы каштуюць ужо не дзесяць а дваццаць разоў даражэй за жыўнасць.

Сялянскія арганізацыі, якіх цяпер дзейнічае вельмі многа, слаба абараняюць селяніна. Яны перш за ўсё пільнуюць, каб ён плаціў складчыну, а дзеячы галоўным чынам пільнуюць свае пасады.

**Мікалай Лук’янюк**
13.09.1998

## Дабіць вёску!

Амаль 40 гадоў хадзіў аўтобус ПКС з Беластока ў Масева і раніцай кожнага дня вяртаўся з Масева ў Беласток. У жніўні гэтага года дырэкцыя ПКС вырашыла ездзіць у Масева толькі два разы ў тыдзень, а ў лістападзе зусім ліквідавала курс у Масева.

Аўтобус цяпер даходзіць толькі да Нараўкі. Такім чынам жыхары Масева, Альхоўкі і іншых навакольных вёсак, каб рана заехаць у горад вымушаны на свой спосаб дабірацца ў Нараўку. Асабліва цяжка стала моладзі, якая вучыцца ў горадзе.

З Масева ў Нараўку добрых 12 кіламетраў, з Альхоўкі — 6 км, але чыноўнікі ПКС гэтага не разумеюць. Яны маюць сваю эканамічную рацыю, уводзяць рэформу, за якую плаціць вёска. Рыначная эканоміка не лічыцца з людзьмі. Вось дык рэформы!

**Мікалай Варанецкі**
13.12.1998

## Абавязковая гімназія

У бягучым годзе ўрад уводзіць школьную рэформу. З верасня вучні, якія закончаць 6 класаў, будуць паступаць у трохгадовую гімназію — першы этап сярэдняй школы.

Гімназіі былі калісьці ў дарэвалюцыйнай Расіі і ў Польшчы да 1948 года. Цяпер гімназіі будуць не толькі ў гарадах, але таксама ў гмінных цэнтрах.

У Нараўцы ніколі не было сярэдняй школы, а зараз плануецца тут гімназія, у якую будуць давозіць вучняў з усёй гміны. Адначасова абмяжуюцца школы ў Ляўкове і Семяноўцы да 6-гадовай падставоўкі.

Назва „гімназія" гучыць высокаўрачыста.

У старажытнай Грэцыі так называлася месца сходаў вучоных і філосафаў.

Раней, у даваеннай Польшчы, вучыліся ў гімназіях дзеці багацеяў. Гімназія была платная і беднякам недаступная. У платнай гімназіі вучыліся тыя, што імкнуліся да ведаў і навуку лічылі гонарам. Сёння не той час і вучыцца павінны ўсе.

Ці абавязковая гімназія будзе гонарам для сучасных гімназістаў?

Здаецца, што не, бо апрача выдатных і добрых школьнікаў у гімназію абавязкова паступяць невукі, якія не палюбілі чытаць, пісаць,

рахаваць, абстрактна думаць.

Калі ў класе многа невукаў, настаўніку немагчыма зрабіць высокі ўзровень навучання. Праца ў гімназіі будзе нялёгкай і таму, што моладзь 13-16-гадовага ўзросту праходзіць перыяд так званага „юнацкага бунту”. Падлеткі часта самі не ведаюць чаго хочуць і без выразнай прычыны бунтуюцца супраць улады дарослых. Пры пашыранай дэмакратыі, калі вучні атрымалі многа свабоды, цяжка ўтрымаць належную дысцыпліну.

На маю думку назву „гімназія” лепш было б замяніць назвай „няпоўная сярэдняя школа”. У сельскім асяроддзі людзі не разумеюць новай школьнай рэформы.

Можа здарыцца так, што найбольшыя невукі па сваёй несвядомасці заўпарцяцца і адкажуцца паступіць у гімназію. Частка гімназістаў закончыць вучобу і не паступіць у ліцэй ці прафесійную школу. Сама гімназія на практыцы нічога не дасць. Настаўнікі баяцца застацца без працы. Частка з іх папоўніць рады беспрацоўных. Але ўсё пакажа час.

**Мікалай Варанецкі**
28.03.1999

## Непаслухмяны камп’ютэр

Няма, пэўна, ніводнага прадпрыемства ці ўстановы, якія не карысталіся б камп’ютэрам. Гэтае вынаходства патрапіць заступіць працу многіх працаўнікоў, захаваць у сваіх нетрах шмат інфармацый.

Камп’ютэр абсталяваў і Кляшчэлеўскі сельскагаспадарчы банк (СОП) у сябе, як і ў чаромхаўскім і дубіцкім філіялах.

Калі мне спатрэбілася ўзяць крэдыт, я дамовіўся з загадчыкам чаромхаўскага філіяла, што неабходныя дакументы змагу аформіць у любы час і неадкладна атрымаць грошы.

Пайшоў я ў канцы кастрычніка. У памяшканні банка было некалькі кліентаў. Калі падышла мая чарга, канторшчыца прыселася да камп’ютэра і хацела аформіць мне крэдыт, аднак машына не схацела слухаць чыноўніцу.

— Трэба крыху пачакаць, — пачуўся ветлівы голас канторшчыцы, — камп’ютэр заняты.

Так паўтарала яна яшчэ некалькі разоў. Урэшце камп’ютэр спрацаваў.

Афармленне майго крэдыту заняло чыноўніцы каля дзесяці хвілін. Як мне паяснілі працаўнікі СОП, праблема заключалася ў тым, што ўсе тры банкаўскія камп'ютэры падключаны на адной лініі.

— Калі афармляецца справа ў Кляшчэлях, — гаворыць загадчыца філіяла Вольга Сцепанюк, — нельга ў той час увесці даныя дубіцкага ці чаромхаўскага кліента. З аднаго боку добра атрымаць неабходныя даныя наконт усіх кліентаў (з Дубічаў, Чаромхі ці Кляшчэляў) не патрабуючы ездзіць у кожную мясціну паасобна, з другога боку нявыгадна, бо кліенту прыходзіцца непатрэбна даўжэй чакаць. Ды і нам стварае гэта лішні клопат. Адцягваецца работа, нервуюцца людзі. Мы ў тым бездапаможны, — з сумам канстатавала мая субяседніца.

А ці сапраўды так быць павінна?

**Уладзімір Сідарук**
14.11.1999

## Урэшце дачакаўся

Прашэнне наконт тэлефона ўпершыню я прад'явіў у 1995 годзе. Тады мне ў Гайнаўскай тэлекамунікацыі сказалі: „Не маем вольнага месца. Трэба чакаць, калі ў Чаромсе паставяць аўтаматычную тэлефонную станцыю".

І я чакаў. Калі пачала працаваць новая АТС, з'явілася іншая праблема. Трэба было арганізаваць грамадскія камітэты тэлефанізацыі і плаціць па 1 500 зл. узносу. У Чаромхаўскай гміне на гэта не згадзіліся. Гмінныя чыноўнікі раілі пачакаць. Прыйдзе час, з'явіцца іншае прадпрыемства і паставіць тэлефон па звычайнай цане. Загаварылі пра гайнаўскі „Рэтэль" — канкурэнтную фірму для дзяржаўнай тэлекамунікацыі.

Аж тут і тэлекамунікацыя зварухнулася. У мінулым годзе пачала пракладаць у Чаромху святлаводны кабель ды прымаць заявы ад новых кліентаў.

Работа праводзілася ўсё лета. Абяцалі паставіць тэлефон у канцы верасня. Не атрымалася. Чакалі ўсю восень. У наваколлі падключылі дамашнія тэлефоны, а Кузаву абміналі.

Урэшце і пра нашу вёску прыпомнілі. З пачаткам года пачалі праводзіць па кватэрах тэлефонную ўстаноўку, а 17 студзеня папрасілі новых кузаўскіх абанентаў прыехаць у Гайнаўку і падпісаць дагавор наконт карыстання тэлефонам.

Пры нагодзе я даведаўся, што ў Кузаве будзе больш за трыццаць новых абанентаў. Дагэтуль было дваццаць (найбольш у гміне). Паступаюць дадатковыя заявы. Тэлефон паставілі ўсе мае суседзі. У агульным ліку, у Кузаве будзе каля шасцідзесяці дамашніх тэлефонаў (на больш за сто гаспадарак).

**Уладзімір Сідарук**
30.01.2000

## Тэлефонныя інвестыцыі

У Арлянскай гміне, якая налічвае амаль 4 тысячы жыхароў, ёсць толькі 500 тэлефонаў. Неўзабаве можа быць іх удвая больш. Новыя тэлефонныя лініі пракладае ўжо фірма „Біятэль" з Беластока.

— Цяпер пачынаецца першы этап будовы падземнай тэлефоннай лініі, — паведамляе Ілья Мартыновіч, гмінны інспектар па справах будаўніцтва. — Ужо пракладаецца святлавод з Орлі ў Маліннікі, потым — у Спічкі, Вульку, Шчыты, Рудуты, Кашалі і Шарні.

Чарговы этап — пракладка падземных тэлефонных кабеляў з Маліннік у Рыгораўцы, Вульку-Выганоўскую, Паўлінава, Чахі-Забалотныя і Москаўцы. Самым складаным будзе трэці этап тэлефоннай інвестыцыі — будова паветранай лініі па бельскай шашы да вёсак Пашкоўшчына, Тапчыкалы, Градалі, Кошкі, калонія Градалі, Дыдулі, Алекшы. Праблема заключаецца ў тым, што сямёра сялян не далі пісьмовай згоды на тое, каб брыгады сувязістаў увайшлі на іх прыватныя ўчасткі. Парадаксальна гэта, бо гэтыя ж сяляне таксама падалі заявы на пастаўку ім тэлефонаў.

— Сваю адмову тлумачаць яны тым, што баяцца, каб рабочыя не раскапалі іхных палеткаў і не нарабілі ім шкоды, — кажа Ілья Мартыновіч. — Фактычна ніякай шкоды не бывае.

І што рабіць з такімі недаверлівымі людзьмі, якія хочуць, каб паставіць ім тэлефон, але перашкаджаюць у пабудове лініі?

**Міхал Мінцэвіч**
15.10.2000

## Сувязь з шырокім светам

План тэлефанізацыі вёскі Бялкі распрацаваны быў некалькі гадоў таму. Людзі ўжо нават перасталі верыць у яго ажыццяўленне, страцілі надзею на тэлефоны ў сваіх хатах. Але ў пачатку кастрычніка справа

скранулася з месца. На працягу месяца быў пракладзены пад зямлёй кабель з Трасцянкі ў Бялкі, а ўжо 6 лістапада ў некаторых дамах пачуліся тэлефонныя званкі. Відаць, дырэкцыя Гайнаўскага аддзялення сувязі пастанавіла напярэдадні 83 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі парадаваць жыхароў вёскі, каб і яны маглі спалучыцца з шырокім светам.

**Мікалай Лук'янюк**

3.12.2000

**Бедныя ля пустой касы**

Гмінны цэнтр сацыяльнай дапамогі ў Орлі традыцыйна з году ў год атрымоўвае менш грошай на статутную дзейнасць. Як нам сказала загадчыца гэтай установы Ірэна Пішчатоўская, цэнтр у 2001 г. атрымае 99 тыс. зл. з ваяводскага бюджэту і 30 тыс. зл. з самаўрадавай касы. Гэтая апошняя датацыя будзе прызначана на мэтавыя дапамогі (20 тыс. зл.) і абеды для маламаёмных вучняў (10 тыс. зл.).

Сёлетні бюджэт Гміннага цэнтра сацыяльнай дапамогі меншы за мінулагодні на 28%. Дапамога ў першую чаргу будзе накіравана на неабходныя мэты, напрыклад, на выплату пастаянных дапамог, сацыяльных пенсій, дапамог па ахове мацярынства. Такімі формамі дапамогі ў Арлянскай гміне карыстаюцца 27 патрабуючых.

Не стае грошай на перыядычныя дапамогі — месячныя, квартальныя і паўгадовыя. У адпаведнасці з законам, самая нізкая дапамога можа скласці нават 14 злотых. На практыцы бываюць яны большыя і часта для многіх абяздоленых людзей з'яўляюцца яны адзінай крыніцай атрымання грошай. Патрабуючых фінансавай падтрымкі ў гміне прыбывае, але скарачэнне бюджэтных сродкаў на сацыяльную дапамогу толькі ўскладняе і так гаротную долю маламаёмных.

**Міхал Мінцэвіч**

25.02.2001

**Нашы гміны ў сеціве**

У апошні час многа гаворыцца пра гміны, войтаў і радных. Гэта падштурхнула мяне да таго, каб паглядзець як прадстаўлены гміны і гарады ў Інтэрнэце. Ці вэб-старонкі гэтых устаноў зроблены прафесійна.

Сваю экскурсію пачаў я з гміны Бельск-Падляшскі (http://www.bielskpodlaski.pl). Старонка гэтая трохмоўная: польская, англійская і ўкра-

інская. Адразу кідаецца ў вочы, што няма беларускамоўнай версіі, а беларусаў у гэтай гміне вельмі многа! Адначасова сайт на ўкраінскай мове не хоча адчыняцца. Я вымушаны быў увайсці на польскамоўную версію. З вэб-старонкі можна даведацца пра гміну амаль усё: турызм, гісторыя, прапанова інвестарам, аб'явы, прозвішчы кіраўнікоў гміны і г.д. Цікавы раздзел „Турызм". Прадстаўлены ў ім „Шлях праваслаўных цэркваў". Можам пабачыць яго на карце і на здымках. Шлях пачынаецца ад ракі Нарвы і вядзе праз Плёскі, Кнаразы, Храбалы, Райск, Гацькі, Грыневічы, Бельск-Падляшскі ў Парцава. Дакладна апісаны маршрут і помнікі, якія можна наведаць. Апрача таго можам даведацца пра аўкцыёны, якія адбываюцца ў гміне, можам перапісаць і аддрукаваць патрэбныя нам дакументы.

Чарговым этапам маёй экскурсіі стала гміна Орля (http://orla.pl/). Гэтая старонка зроблена больш прафесійна чым папярэдняя. Яна вельмі каляровая, празрыстая — аж хочацца заглянуць усярэдзіну. Спачатку націснуў я на „Фотагалерэю". На ёй паказана шмат здымкаў самых важных будынкаў у гміне. Цікавым для мяне паказалася тое, што ў Орлі вельмі прыгожы герб. На старонцы можам даведацца пра састаў гмінных улад, даюцца тэлефоны і кароткае апісанне ўсіх устаноў у гміне. Можам таксама паслаць электронны ліст войту. На сайце пералічаны ўсе інвестыцыі ў гміне. Каротка прадстаўлены фірмы, якія дзейнічаюць на тэрыторыі гміны. Даволі многа месца адведзена гісторыі рэгіёна. Аднак і такая добрая старонка мае недастатак — адсутнасць версіі на іншых мовах.

**Рафал Галушэўскі**
1.12.2002

## Камп'ютэрнае абучэнне

Паводле дагавору Чаромхаўскай гімназіі з Агенцтвам рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ад 10 сакавіка г.г. пачалося камп'ютэрнае абучэнне для жыхароў гміны. Заняткі праводзяцца ў чатырох групах (па 26 слухачоў у кожнай).

— Ахвотных было намнога больш чым спадзяваліся, — гаворыць дырэктар гімназіі Ежы Шыкула. — У адзін дзень прад'явілі прапанову ўдзельнічаць больш ста чалавек. Прадбачваліся чатыры групы па дваццаць курсантаў, але прынялі дваццаць чатыры асобы

больш. Агенцтва прызначыла 15 000 зл. на абсталяванне залы. За гэтыя грошы купілі чатыры камп'ютэры, дыяпраектар і экран. Абучэнне праводзіцца ў дзвюх ступенях: умеласць карыстацца камп'ютэрам на практыцы і выкарыстоўванне камп'ютэрнай тэхнікі і Інтэрнэта ў прафесіі земляроба. Пасля заканчэння абучэння слухачы атрымаюць адпаведныя пасведчанні.

**Уладзімір Сідарук**
6.04.2003

### Пацешылі і... ад'ехалі

25 ліпеня на Чаромхаўскай станцыі праводзілася рэкламная кампанія новага рэйкавага аўтобуса. У пасёлак завіталі высокія чыгуначныя чыноўнікі, прадстаўнікі ваяводскай і павятовай адміністрацыі, мясцовы самаўрад ды шматлікая публіка. Пасля афіцыйных выступленняў прысутныя змаглі паглядзець „камфартабельную цацку", як і пракаціцца на ёй па станцыі. Чарамшане цешыліся, што неўзабаве на такой машыне будуць падарожнічаць кожны дзень на шляху Беласток — Чаромха — Гайнаўка. Ноч аўтобус прастаяў у перонах і зацікаўленыя маглі яго агледзець. Наступнай раніцы госці падаліся ў Гайнаўку, а пасля — у Беласток.

Правёў я кароценькую размову з дырэктарам Прадпрыемства рэгіянальных пасажырскіх перавозаў у Беластоку Галінай Кужынай. Цікавіла мяне справа не камфорту язды, колькі яе хуткасці. Дырэктар пацешыла, што пасля далучэння Польшчы да еўрасаюзных структур, калі знойдзецца стратэгічны інвестар, дык і шлях Белавежа — Гайнаўка — Бельск-Падляшскі будзе вернуты ў карыстанне. Пакуль, гэта аптымістычны прагноз. Дырэктар Кужына здавалася быць пакрыўджанай за тое, што некаторыя чарамшане абвінавачвалі яе ў нелаяльнасці і падпісанні дамовы з ПКС, што ў выніку прывяло да ліквідацыі чыгуначных ліній на Беласточчыне. „Ніякіх паёў у ПКС у мяне няма, — заявіла дырэктар. — У гэтай справе давала я пісьмовыя абвяржэнні. Можна праверыць".

Рэкламная кампанія закончылася, госці ад'ехалі, забраўшы з сабою „камфартабельную цацку". Чарамшанам пакінулі старыя вагоны і абяцанкі, што ў будучыні змогуць падарожнічаць новым чыгуначным транспартам.

**Уладзімір Сідарук**
10.08.2003

**Інтэрнэт у бібліятэцы**

Публічная бібліятэка ў Нарве існуе больш за 40 гадоў. Мне яна памятаецца з 1962 і 1963 года (тады я настаўнічаў у тамашняй сямігадовай пачатковай школе). У бібліятэцы заўсёды было ўтульна і прыемна.

Вельмі шкада, што той вялікі двухпавярховы драўляны будынак (на першым паверсе яго была кіназала і дэманстраваліся фільмы) згарэў датла, а з ім і ўвесь даволі багаты бібліятэчны кнігазбор. Бібліятэку нанава адкрылі ў 1973 годзе. Некалькі гадоў пераводзілі яе з аднаго памяшкання ў другое. Пастаяннага месца яна не мела да часу, калі пабудавалі пажарнае дэпо па галоўнай вуліцы. У ім і зараз знаходзіцца Гмінная публічная бібліятэка (ГПБ).

У ГПБ цяпер 10 717 тамоў, у тым ліку 209 беларускіх кніжак (у 2001 годзе было 583). У гэтым годзе купілі 300 кніжак — перш за ўсё мастацкай і папулярна-навуковай літаратуры. У бібліятэку падарылі яшчэ кніжкі Навуковае выдавецтва „Сэмпэр" з Варшавы, Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа" з Беластока, а таксама індывідуальныя ахвяравальнікі, м.інш. Ангеліна Машынская і Валянцін Галіцкі з Нарвы ды Анэта Анхімюк з Крыўца.

Мае яна 302 верных чытачоў (у мінулым годзе — 271). Чытачы ахвотна карыстаюцца бібліятэчнымі газетамі і часопісамі (тут іх 20), у тым ліку „Ніва" ды „Часопіс". Бяруць іх да чытання таксама дадому.

У ГПБ працуюць Анна Анджэюк-Савіцкая (кіраўнічка бібліятэкі) і Ала Сяткоўская. У гміне дзейнічаюць дзве філіі ГПБ: у Ласінцы (тут працуе Крыстына Келбашэўская) і ў Трасцянцы (Іаанна Шафранская). З малодшымі дзяцьмі найбольш займаецца Іаанна Шафранская і са старэйшымі — Ева Алімоўская (тэатральная інструктарка Нарваўскага асяродка культуры). І зараз у бібліятэках пануе прыемная атмасфера.

Беларускія кніжкі і „Ніву" чытаюць перш-наперш студэнты беларускага філфака, ліцэісты з Бельска і Гайнаўкі, а таксама старэйшыя асобы, якія ведаюць беларускую мову.

Варта адзначыць, што ад нядаўна ў ГПБ карыстаюцца камп'ютэрам. А ўжо ў верасні г.г. чытачы будуць мець магчымасць карыстацца Інтэрнэтам.

**Янка Целушэцкі**
17.08.2003

## Развітанне са школай у Старым Ляўкове

У чэрвені г.г. закончыла сваю дзейнасць Пачатковая школа ў Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна). Існавала яна звыш 200 гадоў. Быў я ў апошні дзень яе працы, яе жыцця. Зрабіў памятныя фотаздымкі настаўнікам і вучням. Жыццё яшчэ бурліла ў класных залах, калідоры ды на школьным панадворку. Зрок прыцягвалі прыгожыя кветкі, дыпломы, насценгазеты, паліца з цікавымі керамічнымі працамі школьнікаў. А мяне трывожыць неадступны сум іназойлівая думка, што гэта апошні дзень школы. Прыгожай ды дарагой мне. У ёй я вучыўся і настаўнічаў з тымі педагогамі, якія мяне вучылі ад першага класа. І празвінеў тут апошні званок.

Апошні раз прыйшлі ў сваю школу па-святочнаму апранутыя дзеці, дзве настаўніцы, бацюшка з матушкай (яны тут вялі ўрокі рэлігіі) ды бацькі вучняў.

— Сёння мы сустракаемся ў нашай школе апошні раз. Жыццё яе наблізілася да фінішу. Надышоў яе канец, — сказаў настаяцель Стараляўкоўскага прыхода Леанід Янкоўскі. — Шкада, вельмі шкада, бо парафія без школы, гэта як чалавек без аднаго лёгкага. Ды пацяшальным ёсць той факт, што сёлета школу ў Ляўкове паспяхова закончылі ўсе вучні.

Развіталіся са сваімі вучнямі настаўніцы Галена Рэент і Крыстына Паскробка. Яны ўручылі апошнія пасведчанні, дыпломы з пячаткай Пачатковай школы ў Старым Ляўкове, ды рэчавыя ўзнагароды.

1 верасня 2004 года дзеці з Ляўкова і навакольных вёсак пачнуць навуку ў Комплексе школ у Нараўцы. Варта дадаць, што на ліквідацыю Пачатковай школы ў Старым Ляўкове паўплывала змяншэнне ўрадавай субсідыі ды падаючы з году ў год лік дзяцей у школьным узросце.

**Янка Целушэцкі**
15.08.2004

## НАШЫ ПЕСНІ

## На край Польшчы

Калі вяртаюся цягніком з далейшага падарожжа, часам у купэ нехта спытае, куды еду. Адказваю загадкава, што еду на канец Польшчы. Тады, натуральна, спадарожнікі пацікавяцца, дзе знаходзіцца той канец нашай краіны. Паясняю, што еду ў Белавежскую пушчу.

Пра турыстычную Белавежу ведаюць у Польшчы амаль усе, пра Гайнаўку чулі менш, а пра Нараўку скажуць, што прыгожая назва мясцовасці.

З кожным годам прыгранічная Нараўчанская гміна прыгажэе. Усе большыя вёскі спалучаны з гмінным цэнтрам асфальтавымі дарогамі, амаль да кожнай вёскі даязджаюць аўтобусы ПКС.

Яшчэ 30 гадоў таму ў гміне не было ніводнай асфальтавай дарогі, ніводнай гладкай вуліцы. Літаральна, на канцы Польшчы, пры мяжы з Беларуссю стаіць доўгае на вярсту Старое Масева, у якім такая ж доўгая, старая брукаваная вуліца.

Некалькі гадоў назад да Масева асфальтавалі дарогу, але вуліцу не залілі, бо асаднікі з Варшавы не захацелі гладкага асфальту. Ім, дзівакам, спадабаўся стары няроўны брук, па якім скачуць аўтамашыны.

У Масеве „варшавякі" выкупілі шмат сядзіб, каб уцячы ад вялікай агламерацыі і адпачываць сярод пушчанскага лесу. Мясцовая моладзь уцякае ў гарады, бо з Масева ўсюды далёка. Да гміннай Нараўкі 14 кіламетраў, да Гайнаўкі 34, да Беластока за 80 км., прытым беластоцкі аўтобус курсіруе ў Масева раз у тыдзень.

З Масева найбліжэй да беларускай вёскі Тушамля і сяла Ціхаволя, якое калісьці было парафіяльным для масяўцоў, але за магутнай сцяной лесу Беларусі сёння не відна. Затое ў прыгранічных мясцовасцях можна бясплатна і свабодна глядзець Беларусь на тэлеканалах, слухаць беларускую і рускую мовы.

Пагранічнікі з Нараўкі пільна ахоўваюць тут дзяржаўную мяжу, каб ніхто яе не нарушыў. Баяцца цяпер ехаць сюды турысты з Беларусі, каб не плаціць штраф за нелегальны гандаль.

**Мікалай Варанецкі**
18.12.2005